Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

6 ЖНІЎНЯ 2022 г. СУБОТА № 153 (29775)

КАПРАМОНТ: ВЫПРАБАВАННЕ ЦІ РАСКОША? 7

ЗВЯРЫ Ў ДОМЕ І НА СТАРОНКАХ 11

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

«ТРЭБА ЗУБАМІ ЧАПЛЯЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ З ТЫМ, ШТО ЁСЦЬ. ТАМУ — ЖАЛЕЗНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА»

Фота БелТА.

Учора Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка працягнуў свае паездкі па рэгіёнах і з рабочым візітам наведаў Пастаўскі раён Віцебскай вобласці. У цэнтры ўвагі кіраўніка дзяржавы — малочнатаварная ферма ААТ «Хацілы-Агра», уборачная кампанія ў рэгіёне і аграпрамысловыя аб'яднанні вобласці.

«Трэба армія — падключай армію»

З самага пачатку Прэзідэнт звярнуў увагу на праблему. Ён адразу папярэдзіў міністра сельскай гаспадаркі і харчавання Ігара Брыло, які па спецыяльнасці з'яўляецца ветэрынарным урачом, аб персанальнай адказнасці, калі толькі Камітэт дзяржкантролю даложыць, што недзе гніллём кормяць жывёлу ў краіне. Па яго словах, ужо ёсць інфармацыя, што месцамі няправільна закладзены ў ямы сянаж намок ад дажджоў. «Пасля дажджоў усё туды зацякло — жыжа. І што з гэтага корму атрымліваецца? Ты ветэрынарны ўрач, жывёлавод», — звярнуўся Аляксандр Лукашэнка да Ігара Брыло. Кантраляваць гэтую сітуацыю Прэзідэнт даручыў і віцэ-прэм'еру Леаніду Зайцу: «А ты глядзі і кантралюй. Мы што, хочам жывёлу загубіць? І потым будзем ахаць, вохкаць, што ў нас падзеж?»

СТАР. 2

КАРАТКА

- **Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка павіншаваў з прафесійным святам працаўнікоў і ветэранаў Беларускай чыгункі.**
- Кіраўнік краіны накіраваў віншаванне з Днём чыгуначных войскаў камандаванню, асабоваму складу і ветэранам транспартных войскаў Рэспублікі Беларусь.
- **Старшыня Савета рэспублікі Наталля Качанава правяла сустрэчу з дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Дзмітрыем Мезенцавым.**

ЦЫТАТА ДНЯ

Таццяна БРАНЦЭВІЧ, намеснік міністра эканомікі:

«Вёскі будучыні» з'явяцца ва ўсіх рэгіёнах Беларусі. На разглядзе ў кіраўніка дзяржавы знаходзіцца «Канцэпцыя рэгіянальнага развіцця», дзе гарады-спадарожнікі — толькі элемент укаранення гэтага праекта на тэрыторыі ўсёй краіны. Пры яго распрацоўцы перад усімі зацікаўленымі асобамі стаялі дзве задачы: забяспечыць камфортнае пражыванне і стварыць новыя працоўныя месцы, вытворчасці. На мой погляд, гэтая канцэпцыя сапраўды дапамагае вырашыць гэтыя два пытанні. Што датычыцца стварэння новых вытворчасцяў, мы ўжо вызначыліся, якія прэферэнцыі працуюць, а якія — не, і зрабілі вывад, што нам патрэбны пэўныя і зразумелыя механізмы работы з зямлёй і маёмасцю. Што да камфортнага пражывання, то той рынцып, які рэалізоўваўся на першым этапе гарадоў-спадарожнікаў, — гадзінная даступнасць да працоўнага месца або жылля, — пакладзены ў канцэпцыю ўсёй краіны. Ужо вызначаны населеныя пункты, падрыхтаваны комплекс мер, і дадаткам да гэтай канцэпцыі з'яўляюцца палепшаныя сацыяльныя стандарты пражывання ў гэтых населеных пунктах».

Сацыяльны вектар

КВАТЭРА Ў АРЭНДУ

Маладыя спецыялісты мараць пра такое жыллё

Андрэй Трэй працуе настаўнікам у школе аграгарадка Мяжысеткі Магілёўскага раёна. Нядаўна ён справіў навасэлле ў арэндной кватэры і вельмі гэтым задаволены. У месяц арэндная платы за яго трохпакаёўку набягае прыкладана 100 рублёў плюс камунальныя паслугі. Вельмі прымальны для маладога чалавека варыянт. «Летась звярнуўся ў аддзел адукацыі, а сёлета ўжо атрымаў ключы ў новым доме, — кажа суразмоўца. — Умовы ёсць, можна цалкам прысвяціць сябе любімай рабоце. І гэта цудоўна».

Прывабная альтэрнатыва

Тэрмін «арэнднае жыллё» з'явіўся ва ўжытку беларусаў роўна 10 гадоў таму — з прыняццем Указа Прэзідэнта № 512. Мэта была стварыць альтэрнатыву для тых, хто здымае кватэры, а заадно папоўніць бюджэт. У Магілёве першыя два арэндныя дамы з'явіліся ў 2014 годзе. Яны былі пабудаваны на вуліцы Алтайскай. Арэндным цалкам стаў і першы электрычны дом, які быў узведзены на вуліцы Вароўскага два гады таму. І гэта практыка паспяхова развіваецца.

СТАР. 4

Асабісты вопыт

ЗАМЕСТ МОРА

Як правесці адпачынак у Беларусі і адчуць, што адпачыў?

Большую частку лета мы, на жаль, ужо пражылі. Але напярэдзе яшчэ як мінімум чатыры тыдні цяпла і сонца, да таго ж жнівень — месяц масавых адпачынкаў.

Яшчэ нядаўна летні адпачынак трывала асацыіраваўся з падарожжам, часцей за ўсё — да мора. Гэтыя часы прайшлі (хочацца верыць, што не незваротна): сёння да мора — дорага, доўга ляцець, ды і наогул складана. Дык што ж рабіць, калі ў адпачынку вы засталіся дома? Як правесці свой сумленна зароблены за год вольны час так, каб адчуць, што сапраўды адпачыў, як загарэць, наплавацца, атрымаць ўражанні і пазітыўныя эмоцыі?

Паспрабуем падысці да пытання рацыянальна.

СТАР. 12

ISSN 1990 — 763X

«ТРЭБА ЗУБАМІ ЧАПЛЯЦЦА І ПРАЦАВАЦЬ З ТЫМ, ШТО ЁСЦЬ. ТАМУ — ЖАЛЕЗНАЯ ДЫСЦЫПЛІНА»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

У сувязі з гэтым персанальнае даручэнне атрымаў і ўпаўнаважаны па Віцебскай вобласці Старшыня Палаты прадстаўнікоў Уладзімір Андрэйчанка. «Адказваеш за Віцебскую вобласць. Каб была жалезная дысцыпліна! Трэба армія — падключым армію. Трэба міліцыя — кінем сюды ўсе сілы», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу і на шэраг іншых недапрацовак, якія лакальна мог назіраць у тым ліку з борта верталёта. «Ніводнага трактара на полі няма. Валкі саломы ляжаць там, дзе ніхто ніколі іх вывозіць з таго поля не будзе. Чаму не здрабнілі, не рассыпалі па полі і не зааралі? Гэта ж элементарна. Трэба мабілізавацца. Не чакайце, што высахне збожжа на полі. Галоўнае, каб страт не было. Пакуль сярэдненька. Чаго б ні каштавала, трэба павялічваць тэмпы», — сказаў ён.

Малочнатаварны комплекс «Валохі» ААТ «Хацілы-Агра».

Прэзідэнт падкрэсліў, што трэба тэрмінова выходзіць на палавіну ўборкі плошчаў каласавых збожжавых, удзяліўшы асаблівую ўвагу месцам з палегліцай, праблемным пасевам. Адначасова трэба канчаткова завяршыць уборку рапсу. А ў цэлым масавую ўборку завяршыць да канца жніўня. Нагадаў Аляксандр Лукашэнка і аб перакідцы тэхнікі для дапамогі ва ўборцы, дзе гэта неабходна.

Беларускі лідар запатрабаваў забяспечыць жалезную дысцыпліну. Ён акцэнтаваў увагу на тым, што эфектыўная работа напрамую ўзаемазвязана з забеспячэннем стабільнасці, дабрабыту і міру. «Вайна пачынаецца тады, калі мы нюх губляем і перастаём працаваць», — падкрэсліў ён. Папярэдзіў кіраўнік дзяржавы і аб недапушчальнасці прыпісак: «Навошта хлусіць? Нам трэба быць сумленнымі адзін перад адным».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што ўсё неабходна рабіць строга па тэхналогіі і ў тэрмін, тады і будзе вынік. Гэта ж датычыцца і пашырэння пасеваў азімага ячменю, якому Прэзідэнт

апошнім часам удзяляе вялікую ўвагу.

Усё можам зрабіць!

У графіку паездкі — наведванне малочнатаварнага комплексу «Валохі» ААТ «Хацілы-Агра». Комплекс увялі ў эксплуатацыю ў снежні 2020 года. Многае на гэтым аб'екце было зроблена гаспадарчым спосабам, дзякуючы ўзважанаму і гаспадарскаму падыходу. Сёння прадпрыемства паказвае фінансавую самастойнасць і забяспечвае высокія надоі. «Гэта добры комплекс. І добра, што ты так яго пабудаваў», — ацаніў вынікі Прэзідэнт, звяртаючыся да кіраўніка гаспадаркі Вячаслава Крыштафовіча.

Падчас паездкі ў Паставы Аляксандр Лукашэнка наведаў мясцовы малочны завод. Кіраўнік дзяржавы азнаёміўся з працэсам вытворчасці сыроў, а таксама прадэгуставаў некалькі відаў прадукцыі. «Вельмі смачна. Вельмі!» — падзяліўся кіраўнік дзяржавы сваімі ўражаннямі.

На заводзе Прэзідэнту прадэманстравалі новыя каўбасныя вырабы з ялавічыны ад Глыбоцкага мясакамбіната. «Усё можам зрабіць!» — ацаніў ён.

Пасля наведвання прадпрыемстваў Аляксандр Лукашэнка правёў у Паставах нараду аб рабоце аграпрамысловых аб'яднанняў Віцебскай вобласці. «Пра тое, наколькі стратэгічна важная сёлета для Беларусі ўборачная кампанія, мы вельмі падрабязна з вамі вялі размову на мінулай селектарнай нарадзе. Былі ўзняты праблемы і пытанні. Асабліва шмат іх было па Віцебскай, Гомельскай абласцях, ды і ў Магілёўскай вобласці хапала. Але і выпрацаваны канкрэтныя шляхі вырашэння тых ці іншых пытанняў», — нагадаў Прэзідэнт.

На селектарнай нарадзе жорсткія задачы былі пастаўлены Мінсельгасхарчу, а таксама ўсёй вертыкалі ўлады — ад губернатараў да кіраўнікоў раёнаў.

«Вядома, мы забяспечым усім неабходным унутраны рынак і патрэбы ў кармах для жывёлагадоўлі. Усё гэта мы зробім. Накормім людзей, накормім жывёл. Але з улікам вострага дэфіцыту, які склаўся на сусветным харчовым рынку, цяперашняя сітуацыя — шанц для нашай сельскай гаспадаркі выйсці на новы ўзровень па экспарце. Экспарт — гэта не толькі продажы. Мы людзей на нашых рынках — новых, старых, асабліва новых — прывучым да нашай прадукцыі. І калі чалавек прывыкне да беларускага, пакаштуе, памацае яго і зразумее, што гэта добры тавар, ён назаўжды наш», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Па яго словах, для таго каб скарыстаць гэты шанец у поўнай меры, трэба рабіць стаўку не на сыравіну, а на гатовую прадукцыю з высокай дабаўленай вартасцю. І займацца гэтымі пытаннямі неабходна ў тым ліку і цяпер, калі ідзе ўборачная кампанія і быццам бы не да гэтага. Прэзідэнт падкрэсліў, што ў гарачую пару выхадных не бывае, дарагі кожны дзень, кожная гадзіна. «Трэба ўбраць якасна і ў тэрмін. Па-сялянску вам скажу: нам трэба кроў з носа перасягнуць пяцідзесяціпрацэнтную мяжу. Як толькі 50 % перасягнём, і псіхалагічна, і ў матэрыяльных адносінах будзе лягчэй. А для гэтага патрэбны дысцыпліна і адказнасць кожнага. Тое, чаго нам не хапае ў слабых гаспадарках. Чаму мы з імі цэляпаемся, эксперыментуем — нам не хапае дысцыпліны. Таму публічна ўсім вам, каб гэта пачулі па ўсёй краіне, гавару: скардзіцца на жорсткасць рашэнняў — нават не хадзіце нікуды і не жальцеся. Гэта датычыцца і кіраўнікоў, і спецыялістаў, і механізатараў. Нікуды не хадзіце скардзіцца на жорсткасць рашэнняў з боку кіраўніцтва прадпрыемстваў. А губернатарам, членам урада, адказным яшчэ раз кажу: кантроль вельмі жорсткі. Усе правы дадзены кіраўнікам, і з іх

Падчас паездкі ў Паставы Аляксандр Лукашэнка наведаў мясцовы малочны завод.

патрабаванне павінна быць перш за ўсё», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, у гаспадарак ёсць усе ўмовы для работы, не хапае толькі дысцыпліны і патрэбнай ступені адказнасці ў некаторых работнікаў.

Не павінна быць штучнага аб'яднання

Прэзідэнт выказаў меркаванне, што стварэнне аграпрамысловых аб'яднанняў у Віцебскай вобласці — правільная стратэгія, але іх работа павінна даваць вынік. «Трэба прадаўжаць узбуйненне гаспадарак. Але не павінна быць штучнага аб'яднання», — падкрэсліў ён. Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў якасці стымулу неабходна дапамагаць прадпрыемствам, да якіх далучаюць гаспадаркі, якія адстаюць.

«Тое, што робім мы ў Віцебскай вобласці, стратэгія правільная. І мы толькі, прыняўшы рашэнне, да паловы дайшлі. У якім плане: мы вызначылі сыравінныя зоны для перапрацоўчых прадпрыемстваў. Але потым яшчэ больш важна, каб уласны фірменны гандаль быў. Ён павінен быць пашыраны. І пашыраць не толькі ў Беларусі. Трэба ісці ў Расію», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Таму інтэграцыйным структурам у Віцебскай вобласці быць. Па словах Прэзідэнта, гэта правільны шлях для канцэнтрацыі прыбытку. У той жа час ён адзначыў, што калі прадпрыемствы могуць працаваць самастойна і дасягаць пастаўленых мэт, то няхай і працуюць самі. «Гэта нават будзе садзейнічаць здаровай канкурэнцыі. Мы ні на кога не ціснем, штучна не ўпіхваем у інтэграцыйныя структуры», — звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка.

Аднак работай створаных у галіне інтэграцыйных структур Прэзідэнт не задаволены. «З якога боку ні паглядзі, гэтае рашэнне правільнае. Паўстае пытанне: а вынік?» — заўважыў ён. Апошні раз на ўзроўні кіраўніка дзяржавы гэта пытанне абмяркоўвалася падчас яго сакавіцкай паездкі ў Глыбокае. «І «раздзіраць» Віцебшчыну па пытанні выніку ад інтэграцыйных аб'яднанняў мы будзем вельмі часта», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

У пачатку года па аграпрамысловых аб'яднаннях быў атрыманы ўбытак ад рэалізацыі прадукцыі. Палова аб'яднанняў мела адмоўную рэнтабельнасць, раслі пратэрмінаваныя даўгавыя абавязацельствы.

«Але вы мне тады абяцалі ўсім калектывам, што палепшыце дынаміку фінансавых паказчыкаў гэтых структур, укамплектуеце пагалоўем жывёлы існуючыя фермы і комплексы, нарыхтуйце якасныя кармы, палепшыце выканальніцкую дысцыпліну і адказнасць кадраў на месцах», — нагадаў Прэзідэнт.

У цэлым па аграпрамысловых аб'яднаннях за першае паўгоддзе вытворчасць скарацілася больш як на восем працэнтаў да ўзроўню мінулага года. Нягледзячы на некаторую станоўчую дынаміку асобных фінансавых паказчыкаў, два найбуйнейшыя аграпрамысловыя аб'яднанні — Віцебскі і Аршанскі мясакамбінаты — працуюць са стратамі.

«Але што мяне больш за ўсё абурае. Было адпаведнае патрабаванне аб своечасовых разліках за малако і мяса, якія закупляюцца ў насельніцтва. Няўжо гэта такія вялікія грошы?» — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

За паўгоддзе ў цэлым па аграпрамысловых аб'яднаннях вытворчасць жывёлы і птушкі ў жывой вазе зменшылася больш як на 12 працэнтаў, вытворчасць малака — на 6,5 працэнта. Скараціліся малочны статак і сярэднія ўдоі.

«З-за недахопу сыравіны застаюцца незагружанымі магутнасці перапрацоўчых прадпрыемстваў. Два — Пастаўскі малочны завод і Верхнядзвінскі масласырзавод — былі загружаны на 100 працэнтаў. Праблемы нарастаюць як снежны камяк. Некаторыя кіраўнікі закрэдытаваных прадпрыемстваў прадаўжаюць спадзявацца, што ім спішуць даўгі, дапамогуць і гэтак далей. Будзем дапамагаць усім, хто ўпіраецца і дае вынік. Не трэба мне гаварыць аб нейкіх аб'ектыўных абставінах. Умовы надвор'я нармальныя, я сказаў бы, ідэальныя», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт падкрэсліў, што калі сёння ў сельгаспрадукцыі дрэнна, то заўтра будзе дрэнна на ўсіх этапах ланцужка. Не будзе жалезнага кулака — нічога не зробіш.

«Мы без Віцебскай вобласці не абыдземся, цяжка будзе: ёсць добрыя раёны, добрыя гаспадаркі. Але ёсць лайдакі, яны ёсць у кожнай вобласці. Дык вось без лайдакоў краіна вельмі проста абыдзецца. Нам хапае прадукцыі без іх. А калі мы тыя грошы, якія лайдакам дорым — і ўсё марна, укладзём у тых, хто добра працуе, атрымаем на 25—30 % прадукцыі ў краіне больш. Таму яны павінны думаць, як будуць жыць далей. Таму трэба зубамі чапляцца і працаваць з тым, што ёсць. Таму жалезная дысцыпліна», — канстатаваў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што аснова стабільнасці ў грамадстве — гэта моцная эканоміка. «Гэта падмурак, гэта галоўнае. Эканоміка — аснова ўсяго. А яна будзе тады, калі мы будзем працаваць. У нас усё ёсць для таго, каб працаваць. Толькі няма дысцыпліны і адказнасці. У некаторых, не ва ўсіх», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта. Фота БелТА.

Актуальна

ЯКІХ УРАЧОЎ ПРАХОДЗІЦЬ ПЕРАД ШКОЛАЙ І ЦІ ПАДЫДУЦЬ ЗАКЛЮЧЭННІ З ПРЫВАТНЫХ МЕДЦЭНТРАЎ

Для школьнікаў і іх бацькоў зараз гарачы час — ідзе падрыхтоўка да новага вучэбнага года. Сярод актуальных тэм і такая — якіх урачоў праходзіць перад школай і ці падыдуць заключэнні з прыватных медыцынскіх цэнтраў, расказала карэспандэнту БелТА намеснік галоўнага ўрача па медыцынскай частцы 5-й гарадской дзіцячай паліклінікі Алена МАТВЕЕВА.

Для атрымання адукацыі, у тым ліку дашкольнай і агульнай сярэдняй, па месцы вучобы неабходна прадставіць медыцынскую даведку аб стане здароўя. Яе афармляе ўрач-педыятр у паліклініцы па месцы жыхарства. Пастановай Міністэрства аховы здароўя нумар 92 ад 9 ліпеня 2010 года ўстаноўлена форма такой медыцынскай даведкі і зацверджана інструкцыя аб парадку яе запаўнення. Падчас правядзення штогадовай дыспансерызацыі ўрач-педыятр складае індывідуальны план на кожнае дзіця, як патрабуе таго пастанова Міністэрства аховы здароўя нумар 96 ад 12 жніўня 2016 года.

Як растлумачыла Алена Мацвеева, у індывідуальным плане дыспансерызацыі адлюстраваны пералік неабходных абследаванняў, які ўключае агляды вузкіх спецыялістаў, агульнаклінічныя лабараторныя і функцыянальныя даследаванні. Урач-педыятр абавязкова павінен азнаёміць аднаго з бацькоў (законнага прадстаўніка) з гэтым індывідуальным планам дыспансерызацыі дзіцяці ў бягучым годзе.

Паводле слоў намесніка галоўнага ўрача, пералік абследаванняў вызначаецца індывідуальна для кожнага дзіцяці з улікам яго дыягназаў. Абавязковымі пры афармленні дзіцяці ў школу будуць агляды неўролага, хірурга, акуліста, гінеколага (для дзяўчынак, калі раней яны не праходзілі такі агляд), стаматолага і лагапеда. З агульнаклінічных даследаванняў неабходна здаць агульны аналіз крыві, агульны аналіз мачы, аналіз крыві на глюкозу, аналіз на гельмінты, прайсці электракардыяграму і ацэнку антрапаметрычных даных (рост, вага, ацэнка фізічнага развіцця).

Меддаведка аб стане здароўя афармляецца па выніках праведзеных дыспансерных аглядаў, аглядаў урачоў-спецыялістаў, праведзеных на працягу 12 месяцаў, што папярэднічаюць месяцу, у якім афармляецца такая даведка. «Урач-педыятр аналізуе медыцынскую дакументацыю. Калі на працягу года дзіця праходзіла спецыялістаў і няма ніякіх скаргаў, зразумела, усе агляды і вынікі аналізаў за гэты перыяд падыдуць для афармлення даведкі», — удакладніла Алена Мацвеева.

Калі па жаданні бацькоў дзіця было кансультавана спецыялістамі ў прыватным медыцынскім цэнтры, то ўрачу-педыятру ў паліклініцы дастаткова прадставіць заключэнне ўрача з медцэнтра.

Па выніках агляду спецыялістаў педыятр абавязкова ўносіць звесткі аб групе здароўя, размеркаванні ў асноўную, падрыхтоўчую, спецыяльную медыцынскую групу або групу лячэбнай фізічнай культуры, а таксама рэкамендацыі па рассадцы ў класе. У даведку ўносяцца і звесткі аб праведзеных прафілактычных прышчэпках.

Дарэчы, згодна з планам, дзіця ў шэсць гадоў павінна прайсці рэвакцынацыю супраць адру, парату, краснухі, а таксама дыфтэрыі, слупняку. Прышчэпкі робяцца ў адзін дзень, але ўводзяцца ў розныя месцы.

Алена Мацвеева звярнула ўвагу, што ў медыцынскай даведцы аб стане здароўя пры афармленні дзіцяці ў школу павінны быць два подпісы — участковага ўрача-педыятра і загадчыка аддзялення. Такая даведка дзейнічае на працягу аднаго года.

У тэму

ЛАТВІЙЦЫ З БЕЛАРУСКІМІ ПАШПАРТАМІ

Сям'я падлетка з Латвіі, які ўзяў інтэрв'ю ў Аляксандра Лукашэнкі, атрымае ў Беларусі біяметрычныя пашпарты

Сям'я Ілы Карозы, якая была вымушана пакінуць Латвію пасля інтэрв'ю з Прэзідэнтам Беларусі Аляксандрам Лукашэнкам на «Славянскім базары», учора атрымала даведкі аб набыцці беларускага грамадзянства. Пра гэта расказалі ва УУС Віцебскага аблвыканкама.

Даведкі аб набыцці беларускага грамадзянства выдалі ўсёй сям'і. Галоўныя дакументы — пашпарты — яшчэ рыхтуюцца, іх плануюць уручыць днямі ўрачыста. «Мама і трое дзяцей падалі дакументы на набыццё грамадзянства Рэспублікі Беларусь у парадку рэгістрацыі. УУС Віцебскага аблвыканкама было прынята рашэнне аб тым, каб даць гэтае грамадзянства. Уручаныя ім даведкі аб набыцці беларускага грамадзянства даюць сям'і права звярнуцца па выдачу пашпартоў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Цяпер яны праходзяць фатаграфаванне, аплачваюць дзяржпошліну. У найбліжэйшы час біяметрычныя пашпарты будуць выдадзены», — расказалі ва УУС.

Фота БелТА.

Рэзананснае інтэрв'ю студэнты рыжскай дзіцячай Акадэміі радыё і тэлебачання, заснавальнікам якой з'яўляецца бабуля Ілы Надзея Бухарына, адбылося ў дзень адкрыцця «Славянскага базару», 14 ліпеня. З-за скандалу, які выліўся ў Латвіі, уся сям'я Ілы Карозы была вымушана пераехаць у Беларусь. Дзякуючы падтрымцы Прэзідэнта і мясцовай улады яны здолелі перавезці сюды свае рэчы і апаратуру акадэміі. Саму ўстанову ў Рызе закрылі, яе стваральнікі плануюць зрабіць новы праект у нашай краіне, запусціўшы яго ў Віцебску. Раней Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка заяўляў, што вучням акадэміі і іх бацькам дадуць беларускае грамадзянства па паскоранай праграме.

Грошы

ФІЗІЧНЫЯ АСОБЫ ЗНОЎ СТАЛІ ЧЫСТЫМІ ПРАДАЎЦАМІ ЗАМЕЖНАЙ ВАЛЮТЫ

Міжнародныя рэзервовыя актывы Беларусі на 1 жніўня 2022 года, паводле папярэдніх даных, склалі $7561,7 млн у эквіваленце, паведамілі ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацыянальнага банка.

За ліпень 2022 года золатавалютныя рэзервы выраслі на $55,5 млн (на 0,7 працэнта) пасля павелічэння ў чэрвені на $96,6 млн (на 1,3 працэнта).

«Пачынаючы са жніўня 2022 года інфармацыя аб аб'ёме міжнародных рэзервовых актываў будзе публікавацца на афіцыйным сайце Нацыянальнага банка без дэталізацыі іх структуры, а таксама пазначэння фактараў, якія паўплывалі на іх змяненне», — праінфармавалі ў Нацбанку.

Тым часам, як стала вядома, у ліпені фізічныя асобы сталі чыстымі прадаўцамі замежнай валюты ў Беларусі. Па выніках месяца яны прадалі на $38,9 млн больш, чым купілі. Аб гэтым таксама сведчаць статыстычныя даныя Нацыянальнага банка.

Агульны аб'ём купленай фізічнымі асобамі наяўнай і безнаяўнай замежнай валюты ў ліпені склаў $779,2 млн, прададзенай — $818,1 млн. У цэлым за студзень—ліпень бягучага года продаж фізічнымі асобамі наяўнай і безнаяўнай замежнай валюты перавысіў яе куплю на $443,6 млн.

Суб'екты гаспадарання — рэзідэнты Беларусі ў ліпені таксама выступалі ў ролі чыстых прадаўцоў замежнай валюты. Зыходзячы з даных Нацыянальнага банка, прадпрыемствы прадалі на $141,2 млн валюты ў эквіваленце больш, чым купілі. Агульны аб'ём купленай юрыдычнымі асобамі замежнай валюты ў ліпені склаў $2,169 млрд, прададзенай — $2,31 млрд.

За студзень—ліпень купля юрыдычнымі асобамі замежнай валюты перавысіла яе продаж на $497,3 млн.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Прэзідэнт Мексікі заклікаў аб'явіць усеагульнае перамір'е на пяць гадоў

Андрэс Мануэль Лопес Абрадор заклікаў спыніць усе канфлікты ў свеце і аб'явіць аб пяцігадовым перамір'і, каб супрацьстаяць крызісу, які ўплывае на народы, паведаміла газета Excelsior. «Мы ўсе павінны ўзяць на сябе абавязацельства не ўносіць уклад у канфрантацыю, у войны, таксама не рабіць стаўку на гандлёвую вайну, таму што гэта датычыцца ўсіх нас», — падкрэсліў ён. Прэзідэнт Мексікі нагадаў, што спачатку сусветную эканоміку пахіснула пандэмія каранавіруса, зараз сітуацыя ўскладняецца рэгіянальнымі канфліктамі, з-за чаго расце беднасць і назіраецца глабальная інфляцыя. Сярод мер па барацьбе з усеагульным крызісам Абрадор прапанаваў дзяржавам стымуляваць вытворчасці, ствараць працоўныя месцы, аказваць узмоцненую ўвагу сацыяльна неабароненым катэгорыям насельніцтва і імкнуцца да супрацоўніцтва краін і народаў.

Цэны на газ у Германіі за год узраслі амаль утрая



Кошт на газ у ФРГ для хатніх гаспадарак узрос за год амаль у тры разы, адзначыла нямецкая газета Bild са спасылкай на партал Verivox. Выданне паведамляе, што цэны на блакітнае паліва ў Германіі дасягнулі новага ўзроўню. У выніку выдаткі грамадзян за выкарыстанне газу павялічыліся на 184 працэнты са жніўня мінулага года. Такім чынам, у параўнанні з цэнамі жніўня 2021-га на блакітнае паліва, калі сярэдняя нямецкая сям'я плаціла за гадавое спажыванне ў сярэднім каля 1250 еўра, то сёлета пры цяперашнім кошце ёй прыйдзецца выдаткаваць за такую ж колькасць больш чым 3,5 тысячы еўра. Як вядома, цэны на энерганосьбіты ў ФРГ пачалі імкліва павышацца з канца мінулага года.

У Вялікабрытаніі ўпершыню ў гісторыі перасохлі вытокі Тэмзы

Гэта адбылося ў выніку засухі, выкліканай анамальна высокімі тэмпературамі, паведаміла газета Guardian. «Пасля працяглага перыяду сухога надвор'я вытокі Тэмзы ў графстве Глостэршыр перасохлі, і слабы струмень зараз толькі ледзь адрозны на адлегласці больш за пяць міль (8 кіламетраў) уніз па цячэнні», — паведаміў выданню дырэктар па навуковай працы ў экалагічнай арганізацыі Rivers Trust Роб Колінз. У ліпені Вялікабрытанія сутыкнулася з анамальнай спёкай. Тэмпература 19 ліпеня пабіла папярэдні рэкорд 38,7 градуса і дасягнула 40,3 градуса. Днямі метэаралагічнае ўпраўленне Вялікабрытаніі паведаміла, што спякотнае і сухое надвор'е не мае намеру здаваць пазіцыі: на наступным тыдні прагназуецца мала дажджоў, а тэмпература можа падняцца да 35 градусаў і вышэй.

КВАТЭРА Ў АРЭНДУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— Арэндная кватэра таннейшая, чым здымная, — тлумачыць, у чым галоўны плюс такога жылля, **начальнік аддзела жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёўскага гарвыканкама Ігар ДАНЬКОЎ.** — Асабліва для тых катэгорый грамадзян, якія маюць права на яе першачарговае атрыманне. Як, напрыклад, маладыя спецыялісты, якіх арганізацыі і ўстановы могуць замацоўваць у сябе з дапамогай арэнднага жылля, у тым ліку ў сельскай мясцовасці. Гэта ўрачы, педагогі, спартсмены, вайскоўцы, супрацоўнікі міліцыі, ратавальнай службы. Па Магілёве для першачаргавікоў устаноўлены каэфіцыент 0,1. З яго улікам метр каштуе ўсяго 38 капеек. Перамнажаеш на агульную плошчу і атрымліваеш суму, у якую абыдзецца арэнда за жыллё.

Дом па вуліцы Бурдэнкі.

З калонамі і французскімі вокнамі

Пра арэнднае жыллё нядаўна ўспаміналі ў Магілёве падчас калегіі Міністэрства ЖКГ. Удзельнікі нават пабывалі ў доме № 2 па вуліцы Бурдэнкі, які быў здадзены сёлета. У ім 28 кватэр атрымалі статус арэндных. Гэта дзвюх- і трохпакаёвыя кватэры агульнай плошчай ад 58 квадратаў да прыкладна 80 квадратных метраў.

Дзесяціпавярховік яшчэ ў працэсе засялення, першы паверх тут зроблены пад крамы, астатнія дзевяць — для жылля. Звонку выглядае самавіта — калоны, французскія вокны, вакол добраўпарадкаваная зона з безбар'ерным асяроддзем. На ўваходзе ў пад'езд — відэакамера, парадны, дастаткова шырокі ганак і ліфт — без запрашальнага маршу, як у іншых дамах, дзе трэба падымацца на пэўную колькасць прыступак. Маладыя маці з каляскамі гэта хутка ацэняць. Ліфт таксама не зусім звычайны. У адрозненне ад дамоў ранейшага пакалення, вялікі — можна без праблем завезці канапу на дзясяты паверх. Плюс з галасавым суправаджэннем і выхадам на два бакі.

Арэндная двухпакаёўка прыемна ўразіла. Два балконы, спальня ў форме няправільнай трапецыі, вялікая кухня. Кватэра зроблена цалкам пад ключ. На вокнах і балконе шклопакеты, на сценах шпалеры і кампактныя батарэі з тэрмарэгулятарамі, на падлозе ламінат. Заязджай, вешай жырандолю і жыві.

Будаўнічая кампанія «Прамжылбуд» паклапацілася, каб утульна было не толькі ўнутры дзесяціпавярховіка, але і звонку. Вялікая рознаўзроўневая пляцоўка зроблена з пад'ездамі і стаянкамі для аўто, шмат зялёных астраўкоў.

Попыт вялікі

На 1 ліпеня ў Магілёве налічвалася 3369 жылых памяшканняў камунальнага жыллёвага фонду, уключаных у склад арэнднага жылля. Пералік вольнага арэнднага жылля і правілы яго атрымання можна паглядзець на сайце Магілёўскага гарвыканкама. Звычайна за кандыдата на арэндныя плошчы хадайнічае арганізацыя ці прадпрыемства, але можна спытаць удачу і самастойна. Для гэтага трэба звярнуцца ў службу «адно акно» адміністрацыі па месцы яго знаходжання. Праўда, ужо на агульнай падставе. У такім выпадку будзе дзейнічаць каэфіцыент не 0,1 а — 0,6 (на сёння па Магілёве). І трэба разумець, што першачарговым правам скарыстаецца ўсё ж такі спецыяліст, аб якім хадайнічаюць.

— Усю інфармацыю мы выстаўляем адразу на сайт, — кажа Ігар Данькоў. — Вельмі шмат хадайніцтваў на першачарговае атрыманне жылля. На новыя кватэры падаецца ад 6 да 8 заяў, на кватэры паўторнага карыстання попыт ніжэйшы, але ўсё залежыць ад месца іх знаходжання. Калі гэта цэнтр, то ахвотных болей. На жыллё, якое прапануецца з частковымі выгодамі — гарачая вада, напрыклад, адсутнічае, — прэтэндэнтаў яшчэ менш.

Попыт на арэндныя кватэры не падае. Калі ў 2014-м навасселле ў арэндным жыллі справіла 159 чалавек, то ў 2021-м — 231. Толькі сёлета за паўгода яго атрымалі 88 чалавек. Летась за карыстанне арэндным жылымі памяшканнямі ў гарадскі бюджэт паступіла 1,487 мільёна рублёў, сёлета пералічана ўжо болей чым 843 тысячы рублёў.

— На мой погляд, арэндныя дамы будуваць выгадна, — лічыць начальнік аддзела. — Асабліва, калі за арэнду плацяць па поўным кошце — 3,84 рубля за квадратны метр. Грошы за арэнду ідуць на спецыяльны рахунак, а потым на будаўніцтва новага арэнднага жылля або яго рамонт. Летась, напрыклад, каля 240 тысяч было выдзелена на рамонт 29 жылых памяшканняў арэнднага фонду, сёлета болей чым 149 тысяч на рамонт 14 памяшканняў. Дарэчы, хутка на праспекце Шміта будзе пабудаваны яшчэ адзін дом, дзе таксама пад арэнднае жыллё прадугледжана некалькі кватэр.

А што на вёсцы?

Падчас калегіі прагучала, што ў Магілёўскай вобласці больш чым 9 % арэнднага жылля пустуе па паўгода і больш. Ёсць такія прыклады ў Магілёве, але па вобласці іх значна болей. На 1 ліпеня іх налічвалася 2399 (усяго 26 344 арэндныя памяшканні). Па словах начальніка ўпраўлення жыллёва-камунальнай гаспадаркі Магілёўскага аблвыканкама Міхаіла Сухарава, тры чвэрці такога жылля знаходзіцца ў вёсцы. Прычым частка яго прынята ад сельскагаспадарчых арганізацый, якія абанкруціліся і знаходзяцца ў аварыйным стане. Не запатрабавана таксама жыллё ў аддаленых населеных пунктах, якое было пабудавана ў перыяд з 1991 да 1996 года за кошт «чарнобыльскіх» сродкаў.

Каб паскорыць працэс, выканкамы пачалі выдзяляць арэндныя метры з умовай, што самі грамадзяне іх адрамантуюць. Па жыллі, якому рамонт ужо не дапаможа, прымаецца рашэнне аб зносе. Толькі за паўгода было знесена 90 такіх дамоў, яшчэ 11 прададзена, у тым ліку за 10 % ад яго ацэначнага кошту. Продаж на такіх льготных умовах арэнднага жылля прадугледжвае Указ № 177, які распрацаваны ў мэтах стварэння дадатковых умоў для комплекснага сацыяльна-эканамічнага развіцця паўднёва-ўсходняга рэгіёна Магілёўскай вобласці. Нізкі попыт на сельскія арэндныя дамы тлумачыцца часцей за ўсё аб'ектыўнымі фактарамі. Такімі, як, напрыклад, аддаленасць ад буйных населеных пунктаў, адсутнасць работы, сацыяльнай і транспартнай інфраструктуры. «Пытанне эфектыўнага выкарыстання арэнднага жылля ў сельскай мясцовасці патрабуе комплекснага рашэння, — падкрэсліў Міхаіл Сухараў.

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.

Транспарт

ПАД СТУК КОЛАЎ СВЕТ СТАНОВІЦЦА БЛІЖЭЙ

Практычна адменены абмежаванні, якія былі ўведзены ў сувязі з «ковіднай» пандэміяй. Намеснік начальніка пасажырскай службы Беларускай чыгункі Сяргей ШЭМЕТ адзначыў, што цяпер наладжана добрая арганізацыя маршрутаў з Беларусі ў гарады Расійскай Федэрацыі.

«Паміж нашымі краінамі курсіруе 16 пар цягнікоў: 9 — з беларускай «прапіскай» і 7 — расійскага фарміравання. Пасажырам дадзена магчымасць праезду да Масквы, Анапы, Адлера, Мурманска і Калінінграда. Ініцыятыва для аднаўлення чыгуначнага паведамлення з краінамі Еўрапейскага саюза з нашага боку прысутнічае. Хтосьці з еўрапейскіх калег адказвае на нашы лісты, хтосьці — не, але мы працягваем работу ў гэтым кірунку», — падсумаваў Сяргей Шэмет.

Wi-Fi толькі ў сучасных саставах

Паводле слоў спецыяліста, на гэты дзень чыгунка актыўна развівае міжрэгіянальныя, рэгіянальныя і міжнародныя зносіны, а таксама скарачае колькасць начных цягнікоў і павялічвае — дзённага курсіравання. Гаворачы аб пашырэнні маршрутнай сеткі, Сяргей Шэмет адзначыў арганізацыю чыгуначных зносін Мінск — Калінкавічы цягніком міжрэгіянальных ліній бізнес-класа.

Адказваючы на пытанні, намеснік начальніка пасажырскай службы БЧ адзначыў, што на гэты момант ukaranenne сеткі Wi-Fi ў цягніках лакаматыўнай цягі не разглядаецца, але ў сучасных саставах, такіх як «Штадлер», гэтая магчымасць ёсць. Напрыклад, вырабляюцца тэхнічныя мадэрнізацыі па рабоце сеткі Wi-Fi ў цягніках нават у глухіх зонах.

Не цягніком — значыць, на аўтобусе

Намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага прадпрыемства «Мінсктранс» Віктар ТОЗІК адзначыў на прэс-канферэнцыі, што ў гэты летні сезон на 245 % узраслі аўтобусныя паездкі з нашай сталіцы ў краіны Прыбалтыкі і часткова Еўропы. Толькі на Вільнюс існуе 26 рэйсаў у суткі. Усе квіткі на гэтыя рэйсы выкупляюцца амаль за месяц да даты адпраўлення.

Тралейбус зноў на праспекце Незалежнасці, як 20 гадоў таму...

Начальнік аддзела арганізацыі пасажырскіх перавозак дзяржаўнага прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь» Аляксандр КАПЦЮХ заявіў, што ў год 70-годдзя тралейбуснага руху ў Мінску структурнае падраздзяленне аднавіла маршрут тралейбуса на праспекце Незалежнасці. Гэта даволі знакавая падзея, паколькі 20 гадоў тралейбус на гэтым участку не працаваў, а цяпер вярнуўся. На дадзены момант тралейбус № 22 «у фаворы», цяпер плануюць павялічваць колькасць рухомага саставу на гэтым маршруце, паколькі ён карыстаецца вялікай папулярнасцю.

Гаворачы аб развіцці электратранспарту ў Мінску, спецыяліст адзначыў, што на гэты момант сябе добра паказваюць тралейбусы з павялічаным аўтаномным ходам (да 15 кіламетраў) і электробусы. Паводле яго слоў, іх распаўсюджванне дазваляе абслугоўваць як дзеючыя маршруты, так і новыя.

Яшчэ адзін рэйс у Мюнхен

З 17 жніўня пачнуць курсіраваць дадатковыя аўтобусы з Мінска ў Мюнхен. Дадатковыя рэйсавыя пасажырскія аўтобусы са сталіцы будуць выязджаць па серадах з аўтавакзала «Цэнтральны» ў 12.00. Час у шляху ў сярэднім складзе 26 гадзін. Назад выязджаць з Мюнхена ў Мінск транспарт будзе па пятніцах у 13.00. Час у шляху назад на дзве гадзіны большы — 28 гадзін.

У «Мінсктрансе» папярэдзілі, што з-за павелічэння часу праходжання граніцы з сумежнымі дзяржавамі магчымыя затрымкі пры выкананні аўтобусных рэйсаў.

Сяргей КУРКАЧ.

У тэму

А КАРТКАЙ МОЖНА?

Ці змогуць беларусы аплаціць праезд наземным транспартам банкаўскай карткай

У Мінску разглядаецца магчымасць увядзення аплаты наземнага транспарту банкаўскай карткай. Пра гэта падчас прэс-канферэнцыі «Сучасныя пасажырскія перавозкі ў Беларусі. Што новага прынёс 2022 год у транспартную сферу краіны» расказалі «Звяздзе» ў аддзеле арганізацыі пасажырскіх перавозак дзяржаўнага прадпрыемства «Сталічны транспарт і сувязь».

«Мы ўжо спрабавалі ўводзіць аплату наземнага праезду з дапамогай плацежнай карты, але банк і прадпрыемства «Мінсктранс» гэтае пытанне адправілі на дапрацоўку, паколькі існавалі пэўныя тэхнічныя няўзгодкі. У метрапалітэне валідатары стацыянарныя, там круглы год зададзеная тэмпература і ніякіх тэхнічных праблем не ўзнікае. А ў рухомым саставе тэмпература мяняецца і ў залежнасці ад часу сутак, і ў залежнасці ад сезона. Таму цяпер мы дапрацоўваем шэраг праграмных праблем і ў далейшым плануем укараніць функцыю такой аплаты і ў наземным транспарце», — заявілі ў «Сталічным транспарце і сувязі».

НА ПАРАХАВОЙ БОЧЦЫ

Да чаго прывядзе глабальны энергетычны крызіс?

Энергетычны крызіс у Еўропе працягвае набіраць абароты і за апошні месяц перайшоў ад «дрэннага» сцэнарыя да «жудаснага». Аб гэтым паведаміў партал навін Business Insider са спасылкай на даныя Bank of America. Адзначаецца: існуюць рызыкі таго, што запасаў газу на зіму ў Еўропе можа не хапіць. «Пры рабоце газаправода «Паўночны паток» на 20 працэнтаў ад яго магутнасці назапашвання запасаў газу ў сховішчах у зімовы час можа аказацца недастаткова, таму цяпер ЕС плануе шырокамаштабнае нармаванне спажывання», — лічаць аналітыкі Bank of America. Шэраг заходніх краін, у тым ліку Германія і Францыя, ужо цяпер пачалі жорстка нарміраваць выкарыстанне газу. Падкрэсліваецца, што напружанасць у адносінах паміж Расіяй і Еўропай сур'ёзна паўплывала на энергетычны рынак: цэны на прыродны газ дасягнулі 200 еўра за мегават-гадзіну. Пры гэтым эксперты прагназуюць, што адваротны эфект заходніх санкцый набірае абароты — кошт газу будзе павялічвацца і надалей, раскручваючы махавік інфляцыі і сацыяльную напружанасць. Да чаго прывядзе глабальны энергетычны крызіс?

ДАЎГІ — 1,7 ТРЫЛЬЁНА ЕЎРА

Паводле звестак, сабраных Anadolu на аснове даных Gas Infrastucture Europe і Еўракамісіі, Стары Свет спажывае прыкладна 400 мільярдаў кубаметраў прыроднага газу за год. Газасховішчы на сваёй тэрыторыі маюць 18 краін — членаў ЕС. Іх агульныя магутнасці складаюць каля 110 мільярдаў «кубоў». Больш за ўсё прыроднага газу спажывае Германія (92 мільярды кубаметраў за год). У той жа час гэтая краіна валодае найбуйнейшым патэнцыялам захоўвання прыроднага газу ў Еўропе, які ацэньваецца прыкладна ў 24 мільярды кубаметраў. Пры гэтым узровень запоўненасці газасховішчаў Германіі складае 66 працэнтаў.

Умяшчальнасць газасховішчаў Італіі складае каля 20 мільярдаў кубаметраў, а яе спажыванне знаходзіцца на ўзроўні 71 мільярда кубаметраў за год. Запоўненасць сховішчаў Італіі на сёння дасягнула 70 працэнтаў. Нідэрланды, здольныя захоўваць у сярэднім 14 мільярдаў кубаметраў прыроднага газу, штогод расходуюць 44 мільярды кубаметраў. Запоўненасць газасховішчаў гэтай краіны складае 62 працэнты.

Францыя валодае чацвёртым па велічыні патэнцыялам захоўвання газу ў Еўропе, пры гэтым яе газасховішчы цяпер запоўнены на 75 працэнтаў. Умяшчальнасць сховішчаў блакітнага паліва ў Пятай рэспубліцы складае каля 13 мільярдаў кубаметраў, а спажыванне краіны ацэньваецца на ўзроўні 40 мільярдаў кубаметраў у сярэднім за год. Польшча, якая штогод спажывае 22 мільярды кубаметраў газу, здольная назапасіць каля 3,6 мільярда кубаметраў. Узровень запоўненасці газасховішчаў гэтай краіны ацэньваецца ў 98 працэнтаў. Прычым Варшава ўжо цяпер заявіла, што не будзе дзяліцца газам з іншымі краінамі (а хто б сумняваўся).

У Еўропе энергетычныя і камунальныя прадпрыемствы вымушаны браць крэдыты, каб аплаціць свае выдаткі на фоне павышэння кошту энергарэсурсаў. Такім чынам, на сёння агульны доўг гэтых кампаній перавысіў 1,7 трыльёна еўра. Аб гэтым паведаміла ТАСС са спасылкай на Bloomberg. Паводле даных агенцтва, выдаткі камунальных прадпрыемстваў і энергакампаній ў краінах Еўропы пачалі павялічвацца яшчэ падчас пандэміі. Калі ў кастрычніку — снежні 2019 года запазычанасць складала каля 1,1 трыльёна еўра, то зараз яна перавысіла 1,7 трлн еўра. Bloomberg зазначае, што такая сітуацыя склалася з-за ўведзеных санкцый у дачыненні да Расіі і павышэння кошту нафты і газу.

РЭХА САНКЦЫЙ

Сітуацыя набыла сусветны маштаб. «Мы перажываем першы глабальны энергетычны крызіс», — адзначыў The Foreign Policy эксперт па энергетыцы з Калумбійскага ўніверсітэта Джэйсан Бордаф. Ён пацвердзіў, што дэфіцыт ударыў амаль па ўсіх рэгіёнах свету і па крыніцах энергіі. «Хвалевы эфект назіраецца паўсюль, і, як мне здаецца, горшае яшчэ наперадзе», — дадаў Бордаф.

Рынкі адчувалі сур'ёзны недахоп яшчэ летась. Гэта вынік спалучэння цэлага шэрагу фактараў: пандэміі, запаволенні паставак у ланцужках забеспячэння і кліматычных ўзрушэнні. Сітуацыю пагоршыла рэха еўрапейскіх санкцый. Гэта яшчэ больш узняло цэны на сусветных рынках. Цяпер масла ў агонь падлівае экстрэмальная спякота, выкліканая кліматычнымі зменамі, і ўзніклыя праблемы толькі ўзмацняюцца. «У нас узаемазвязаная глабальная сістэма, — сказаў Бордаф. — Калі націснуць у адным месцы, ціск адчуецца і ў іншых месцах».

Апошні раз катастрафічны дэфіцыт энергарэсурсаў (праўда, тады толькі нафты) узнік у 1970-я гады. Тады АПЕК увяла эмбарга, якое ўдарнай хваляй пракацілася па ўсёй нафтавай галіне. З-за гэтага крызісу на свет з'явілася Міжнароднае энергетычнае агенцтва (International Energy Agency), а прамыслова развітыя краіны пачалі стварацъ стратэгічныя рэзервы, рыхтуючыся да будучых перабояў з пастаўкамі, расказаў эксперт Антуан Хальф з Цэнтра глабальнай энергетычнай палітыкі Калумбійскага ўніверсітэта. Але ў многіх эканомік, якія развіваюцца, і краін, якія захраслі ў даўгах, няма такой падушкі бяспекі, і яны абсалютна не абаронены ад узрушэнняў.

Многія дзяржавы вярнуліся да вугалю. Калі ў маі паглыбіўся энергетычны крызіс, Індыя паабяцала адмовіць і павялічыць здабычу ў вугальных шахтах. У чэрвені індыйскі імпарт вугалю дасягнуў рэкордная адзнакі. І гэта, хутчэй за ўсё, надоўга, аб чым нядаўна папярэдзіў індыйскі міністр энергетыкі Радж Кумар Сінгх.

«Гэта гісторыя не толькі пра нафту і газ, — лічыць энергетычны эксперт з RBC Capital Markets Хеліма Крофт. — Гэта гісторыя пра ключавую сельскагаспадарчую прадукцыю, пра магчымы харчовы крызіс глабальнага маштабу. Гэта таксама стварае палітычныя небяспекі, таму што церпяць вельмі многія грамадзяне».

Надыходзячай зімой гэтыя рынкі могуць сутыкнуцца з новымі ўзрушэннямі, калі ў поўным аб'ёме запрацуюць еўрапейскія меры, накіраваныя супраць расійскай нафты. «У снежні нас могуць чакаць новыя перабоі на энергетычным рынку і павышэнне цэн на нафту. Многае залежыць ад таго, як будуць укараняцца гэтыя санкцыі», — заўважыла Хеліма Крофт.

ГРОНКІ ГНЕВУ

Кашмар энергетычнага крызісу на Захадзе вырасцъ ў бунт супраць эліт, адзначыў The Telegraph. «На дварэ лета перад бурай. Не будуйце сабе ілюзій: цэны на энерганосьбіты падскочаць да нябачанага ўзроўню», — адзначыла выданне. У краінах, якія развіваюцца, сітуацыя катастрафічная: электрычнасць згасае ад Кубы да Паўднёвай Афрыкі. Шры-Ланка — толькі адна з чарады бедных краін, дзе ліхаманкай чакае пераварот з-за ганебнага недахопу бензіну і эканамічнага дэфолту. «Захаду гэтага армагедону не пазбегнуць. У нейкім сэнсе ён, наадварот, стане яго эпіцэнтрам, а Вялікабрытанія — самым ядром», — піша The Telegraph.

Выданне адзначае, што выбудаваная на міфах і самазадаволенні тэхнакратычная сістэма Еўропы і Амерыкі разбураецца. Яе асноватворная легенда, якая абяцала ўдалае зліццё нацыянальных дзяржаў у адзіны сусветны ўрад з адзінымі ланцужкамі паставак, ператварылася ў павучальную прытчу аб тым, чым багатая глабалізацыя. «Нягледзячы на ўсе спробы выставіць канфлікт на Украіне гэткім «чорным лебедзем», скачок цэн на асноўныя тавары ў нестабільным свеце быў цалкам прадказальны. І зараз людзі здзіўляюцца, чаму гэта лідары не распрацавалі ніякіх надзвычайных планаў, улічваючы, колькі ў свеце запасаў газу, нафты і вугалю. ЕС бяздзейнічаў», — канстатаваў The Telegraph.

Гэтаму фіяска няма іншага тлумачэння, акрамя дзесяцігоддзяў ілжывых высноў і палітычных памылак эліты. Пасля фінансавага краху істэблішмент практычна перакананў грамадскасць змірыцца з «ачышчальнай» жорсткай эканоміяй: выбаршчыкам распавялі, што частка віны за крызіс ляжыць на іх саміх і што ім таксама трэба загладзіць памылкі. Але на гэты раз элітам не адысці ад адказнасці. На думку шэрагу аналітыкаў, першай у Еўропе да адключэнняў электраэнергіі пры ўсёй сваёй атамнай прамысловасці можа дайсці Францыя — а ёй да пратэстаў не прывыкаць. Аднак сапраўдны выбух можа грымнуць у Вялікабрытаніі. «Брытанія можа стаць парахавой бочкай Еўропы. Хто б ні прыйшоў на змену зрынутаму Борысу Джонсану, ён не атрымае перакананьчай перамогі на ўсеагульных выбарах,

а палітычная атмасфера напальваецца. Людзі расчараваныя: два гады патрачаны марна, а ўрад так і не скарыстаўся брэксітам на карысць краіны», — заўважае The Telegraph. Выданне сцвярджае, што брытанскіх спажыўцоў чакае самы балючы ўдар. «У нас ужо самая высокая інфляцыя ва ўсёй «вялікай сямёрцы». А з-за цэлага шэрагу фатальных памылак — ад закрыцця газасховішчаў да нежаданя скарыстацца ўнутранымі радовішчамі нафты і газу — нам яшчэ доўга трэба будзе мірыцца з завоблачнымі цэнамі на энерганосьбіты. А спажыўцоў чакаюць новыя засмучэнні», — адзначыла The Telegraph.

У Брытаніі ўжо распачаўся рух грамадзянскага непадпарадкавання, шмат у чым натхнёны бунтам супраць падушнага падатку. Кампанія «Не плаці» заклікае людзей да масавай забастоўкі ў кастрычніку, калі ўрад павысіць кошты на энерганосьбіты. Кампанію ўжо падтрымалі тысячы чалавек. «І калі справа дойдзе да бунту, чым адкажуць улады? Маштабы будучай інфляцыі такія, што мільёны людзей проста не змогуць плаціць па рахунках, прычым сярод іх будуць пенсіянеры і нават тыя, хто яшчэ нядаўна лічыўся сярэднім класам. Нам усім пагражае бяда, і правілы гульні, напэўна, зменяцца. Мы толькі пачалі разумець, наколькі непрадказальнымі будуць найбліжэйшыя гады і як дрэнна мы гатовыя да наступстваў», — падкрэсліваецца ў артыкуле The Telegraph. Як заўважыла выданне, прагноз можа падацца самым змрочным, аднак у той жа Брытаніі сапраўды склалася адчуванне, што тамтэйшую зламаную эканоміку чакае трагічны фінал: «Ясна: кароль жа голы, а байкі, каб нас адцягнуць, у эліты скончыліся».

Фінскі палітолаг Міка Аалтола таксама прагназуе рост незадаволенасці ў краінах Еўропы на фоне павышэння коштаў і дэфіцыту энергарэсурсаў. Пра гэта ён заявіў у інтэрв'ю фінскаму парталу навін MTV, паведаміла РІА «Навіны». На думку палітолага, цэны на аўтамабільнае паліва, якія выраслі за апошні час у краінах Еўропы, можна назваць прэлюдыяй да дэфіцыту энерганосьбітаў. У сувязі з гэтым урадам еўрапейскіх краін неабходна падрыхтавацца да «зімы незадаволенасці». «Гэта прывядзіць да канфлікту інтарэсаў розных сацыяльных груп і выклікае раскол», — лічыць эксперт. Як адзначае Bloomberg, такая сітуацыя можа разбурыць адзінства Еўрапейскага саюза і адрадзіць даўнія рознагалоссі паміж заходнімі краінамі ўжо гэтай зімой.

Захар БУРАК.

Даслоўна

«Вы ж падштурхнулі свет да таго, што ён будзе іншы не на вашу карысць»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў інтэрв'ю інфармацыйнаму агенцтву «Франс Прэс» выказаўся аб залежнасці краін Еўрасаюза ад расійскіх энергарэсурсаў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што на фоне санкцый, уведзеных Еўрасаюзам, стала відавочнай іх залежнасць ад расійскіх энергарэсурсаў: «Чаму ў вас такая бурная інфляцыя? Чаму вы ўвесь час крычыце, што вам бракуе прыроднага газу, нафты і гэтак далей?»

Кіраўнік беларускай дзяржавы раіць Еўрасаюзу сябраваць з Беларуссю і Расіяй. «Адночы выказаў шалёную думку. Вось калі б вы, еўрапейцы, былі дружныя з намі, беларусамі, расіянамі, альянс быў эканамічна, фінансава, тэхналагічна, у ваенных адносінах непераможным. Мы б не ваявалі супраць каго б там ні было. Велізарныя рэсурсы, тэрыторыя на ўсходзе і найвысокія тэхналогіі на захадзе ў вас, у немцаў і гэтак далей. Вось дзе ваша шчасце. Але вы не можаце гэтую палітыку праводзіць. Вам не даюць. Вось цяпер еўра зваліўся да ўзроўню долара. Амерыканцам ужо добра. Няўжо вы гэтага не бачыце? Вы ўсё бачыце, усё разумееце», — заявіў беларускі лідар.

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў краінах Заходняй Еўропы ўжо няма палітыкаў ранейшага фармату і маштабу, такіх як Шарль дэ Голь або Жак Шырак, Гельмут Коль або нават Ангела Меркель. «Паглядзіце, што робіцца ў Вялікабрытаніі, у Італіі нейкую валтузню задумалі. Вы бачыце, што адбываецца ва ўсходнееўрапейскіх краінах — Польшчы, Літве, Латвіі. Там жа ўладам давярае 15-20 працэнтаў. І калі сапраўды пройдуць выбары, проста цяперашнія Дуды-Маравецкія будуць змецены. І так і будзе», — упэўнены кіраўнік дзяржавы.

Ён заклікаў не ўскладняць гэтае жыццё і жыць дружна. «Мы да гэтага гатовыя. Тым больш Расія. Расіі нічога не трэба. У яе ўсё ёсць. Ёй трэба мір, спакой, гандляваць. Ёй трэба прадаць газ, а вам трэба купіць. Навошта вы блакіруеце? Купляйце гэты газ, плаціце. Навошта вы санкцыі ўводзіце? Ну немагчыма мільярду чалавек супраць 6-7 мільярдаў увесці санкцыі», — перакананы Аляксандр Лукашэнка.

Ён упэўнены, што ўсе гэтыя дзеянні ў выніку пойдуць на шкоду іх жа ініцыятарам: «Вы ж падштурхнулі свет да таго, што ён будзе іншым не на вашу карысць. Вы што думаеце, у Іране проста так сабраліся Іран, Расія і Турцыя (натаўская краіна)? Не. А Індыя, Кітай. Яны ж не падтрымліваюць вас. Ім вайнушка не патрэбна. Нават Паўднёвай, не кажучы аб Паўночнай Карэі. Нават японцам, ім гэта не трэба. Яны наеліся гэтых войнаў. Яны жадаюць у міры жыць. Навошта вы ўзрушылі ўвесь свет? Не трэба гэта рабіць».

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «БАТЭ» – управляющая компания холдинга «Автокомпоненты», г. Борисов, ул. Даумана, 95
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46
Адрес ЭТП	www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов – транспортные средства, бывшие в употреблении, по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Даумана, 107

Лот №	Наименование	Начальная цена (с НДС 20 %), бел. руб.
1	Микроавтобус-вагон GAZ-322132, рег. знак АК 5974-5, 2011 г. в.	**7 176,60**
2	Грузовой специальный фургон изотермический GAZ-3302 270710, рег. знак АК 7416-5, 2002 г. в.	**3 072,60**
3	Грузовой бортовой тентовый MAZ 53366, рег. знак АК 7440-5, 1998 г. в.	**5 556,60**
4	Прицеп бортовой тентовый MAZ 837300 3030, рег. знак А 7012 В-5, 2014 г. в.	**9 228,60**

С подробной информацией по предмету электронных торгов можно ознакомиться на сайте организатора электронных торгов: www.cpo.by. Шаг аукциона: 5 % от текущей цены

Задаток 10 % от начальной цены лота перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок подписания договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона. Продавец составляет и направляет договор для подписания победителю аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов

Если между продавцом и покупателем (победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся приобрести предмет электронных торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты предмета электронных торгов, такая оплата должна быть произведена в течение **30 календарных дней** после заключения договора купли-продажи

Электронные торги проводятся в соответствии с регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by. **Ответственность** участника аукциона, его **права и обязанности, штрафные санкции** прописаны в **соглашении** о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Данное соглашение является договором присоединения и размещается на странице лота во вкладке «Документы» по адресу: www.ipmtorgi.by. Страница лота по указанному адресу содержит также информацию о типе торгов и общих правилах их проведения. Победителем аукциона признается участник, предложивший максимальную цену

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить **вознаграждение 3 %** от цены продажи лота в течение **3 рабочих дней** после проведения электронных торгов

Организатор электронных торгов имеет право снять предмет аукциона с электронных торгов в любое время до момента определения победителя электронных торгов без объяснения причин снятия

Предыдущее извещение о проведении электронных торгов опубликовано в газете «Звязда» 18.05.2022 г.

Дата и время начала и окончания электронных торгов: **24.08.2022 с 11.00 до 12.00.** Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Заявки на участие в электронных торгах принимаются по **22.08.2022 до 17.00** на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные данные	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 (29)-317-95-42; +375 (44) 704-92-06. E-mail: auction@cpo.by**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ЗАО «Центр промышленной оценки»

сообщает о проведении **22.08.2022 в 14.00** открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего **КУП «Жилищно-эксплуатационный участок № 2 Центрального района г. Минска».** Список лотов: **1. Сейф BSD530,** инв. № 700147. Начальная цена **224,00 бел. руб.** (без НДС) **2. Сварочный аппарат «Оливер» MMA200,** инв. № 700267. Начальная цена **200,00** бел. руб. (без НДС). **3. Машина паркетошлифовальная CO-206,** инв. № 420129. Начальная цена: **960,00 бел. руб.** (без НДС). Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с организатора торгов. Шаг аукциона: 5 % от начальной цены. Местонахождение: г. Минск, пр-т Независимости, д. 27А. Победитель аукциона либо единственный участник, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 %, обязан возместить затраты на их проведение и оплатить вознаграждение организатору аукциона. Ознакомление с предметом торгов +375 (29) 159-77-01.

Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 01.06.2022, в ЕГРСБ 01.06.2022.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Дата, время и место проведения аукциона: 22.08.2022 в 14.00, г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Заявки на участие в аукционе принимаются до 17.00 19.08.2022 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703.

Извещение о проведении аукциона, сведения о реализуемых лотах, подробная информация о порядке проведения аукциона размещены на сайте www.bankrot.gov.by, а также на сайте организатора аукциона www.cpo.by

УНП 192590363

РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «БОРИСОВХЛЕБПРОМ» (ПРОДАВЕЦ)

Лот № 1, состав: 1. Здание производственного корпуса, инв. № 620/С-33108, 1084,7 кв. м; 2. Здание проходной, инв. № 620/С-33107, 25,8 кв. м. Адрес: Минская обл., Дзержинский р-н, г. Дзержинск, ул. Фоминых, 1. Земельный участок 622250100001002286, 0,7179 га (Право постоянного пользования. Доля: 22/25). Начальная цена с НДС – 572 962,81 руб. Задаток – 57 296,28 руб. Шаг аукциона – 5 %.

Аукцион состоится 07.09.2022 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3-й этаж, каб. 4.

Порядок оформления участия в аукционе, условия аукциона и полный текст извещения содержатся на сайте Организатора аукциона ino.by. Задаток перечисляется на р/с BY85BAPB30127802900100000000 в ОАО «Белагропромбанк», BIC BAPBBY2X. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Окончание приема заявлений и задатков – 05.09.2022 в 11.00.

• Организатор аукциона:
220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9,
8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52
• www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир» (продавец) ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 17 АВГУСТА 2022 ГОДА ОТКРЫТОГО ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА СО СНИЖЕНИЕМ ЦЕНЫ по продаже имущества в 11.00 в городе Гомеле по улице Гагарина, 20

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС, бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС, бел.руб.
	Местонахождение лотов №№ 1–3: г. Гомель, ул. Войсковая, 16		
1	**Грузовой бортовой тентовый GAZ 3309 KI 4738 «CUPAVA», рег. № АА 5518-3,** год выпуска – не определен, номер кузова (рамы) Y3H47380060038153, цвет – белый, состояние – удовлетворительное, пробег – 518 150 км	**3 476,00**	173,80
2	**Полуприцеп-цистерна CLAYTON CLAYTON, рег. № А 9531 В3,** 1997 года выпуска, номер кузова (рамы) 9724521, цвет – серебристо-синий, состояние – удовлетворительное, пробег – 363 050 км	**49 900,00**	2 495,00
3	**Трактор колесный МТЗ-80, рег. № ЕВ-3 9154,** 1992 года выпуска, зав. номер 861379, состояние – удовлетворительное	**6 798,00**	339,90

Продавец: ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир», г. Гомель, ул. Севастопольская, 106. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактным тел.:** 8ч(0232) 25-49-97, 8(033) 372-87-77 – начальник транспортного цеха Туманов Александр Николаевич. **Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо:** 1) Оплатить задаток на расчетный счет **Продавца (ОАО «Гомельский ликеро-водочный завод «Радамир»):** р/с BY86 BLBB 3012 0400 0783 1600 1007 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гомельской области, УНН 400078316, БИК BLBBBY2X, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2) Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 6 августа 2022 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00. **Прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 15 августа 2022 г. в 16.00. Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения.** В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на **5 (пять) %.** Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом в течение **5 (пяти)** рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: подписать протокол о результатах аукциона; произвести оплату услуг (вознаграждение) по организации и проведению торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **20 (двадцати) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно договору купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). Ранее опубликованное извещение о торгах размещено в газете «Звязда» от 09.09.2021 г. № 173 (29542), от 10.03.2021 г. № 47 (29669), от 19.04.2022 г. № 75 (29697). **Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы».**

Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.

ОАО «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» (организатор аукциона) по поручению ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин (продавец имущества) ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 6 СЕНТЯБРЯ 2022 ГОДА ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА В 11.00 В ГОРОДЕ ГОМЕЛЕ ПО УЛИЦЕ ГАГАРИНА, 20

УНП 400076540

№ лота	Наименование предметов торгов	Начальная цена продажи имущества, с учетом НДС (20 %), бел. руб.	Сумма задатка, с учетом НДС (20 %), бел. руб.
1	**Капитальное строение с инв. № 320/С-14328** общей площадью **692,4 кв. м,** назначение – здание специализированное транспорта, наименование – **гараж на восемь транспортных единиц** (составные части и принадлежности: одноэтажное кирпичное здание гаража на восемь транспортных единиц). Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/10, гараж. **Условие продажи:** После проведения аукциона Продавец уполномочивает покупателя в установленном законодательством порядке обратиться за осуществлением **необходимых действий, направленных на выделение и регистрацию земельного участка,** необходимого для обслуживания предмета аукциона, а также проведение государственной регистрации договора купли-продажи. Покупатель осуществляет регистрационные действия по выделению земельного участка в границах, определенных специализированными службами, согласованными с продавцом. Расходы по приведению в надлежащий вид всей необходимой документации, оформлению земельного участка возлагаются на Покупателя (предварительная схема пользования земельного участка под объекты продаж прилагается). **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003004080** общей площадью **0,6257 га** – для обслуживания гаража на восемь транспортных единиц, гаража на пять транспортных единиц с диспетчерской (земельный участок для размещения автостоянок и гаражей). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/9	**126 000,00**	6 300,00
2	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34622** площадью **9 151,1 кв. м,** назначение – производственное помещение, наименование – **изолированное помещение № 14. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-14	**744 000,00**	37 200,00
3	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34612** площадью **3 453,9 кв. м,** назначение – производственное помещение, наименование – изолированное помещение № 8. Адрес: Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-8	**288 000,00**	14 400,00
4	**Изолированное помещение с инв. № 320/D-34623** площадью **35 167,2 кв. м,** назначение – производственное помещение, наименование – изолированное помещение № 15. **Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1-15. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **340800000003000135** общей площадью **17,582 га** – для обслуживания зданий и сооружений меховой фабрики (для размещения объектов промышленности). **Право аренды (доля в праве 241/250). Доля права на земельный участок будет выделена после регистрации изолированного помещения № 15. Адрес (местоположение):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1. **Капитальное строение с инв. № 320/С-38054** общей площадью **6,8 кв. м,** назначение – здание неустановленного назначения, наименование – **домик дежурного (инв. № 110-0020). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/23. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100001004544** общей площадью **0,0024 га** – для строительства и обслуживания домика дежурного (для размещения объектов неустановленного назначения). **Право постоянного пользования (доля в праве 1/1). Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/23, участок № 1. **Капитальное строение с инв. № 320/С-38827** общей площадью **2 034,2 кв. м,** назначение – сооружение специализированное автомобильного транспорта и автодорожного хозяйства, наименование – **участок автодорог для обслуживания помещений ГПК. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2, территория ОАО «Белфа» г. Жлобин. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003009674** общей площадью **0,6752 га** – для строительства и обслуживания автодорог промышленной площадки (для размещения объектов автомобильного транспорта). **Право аренды. Адрес (местоположение):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 (земельный участок № 2). **Капитальное строение с инв. № 320/С-14646** общей площадью (протяженностью) **19,2 кв. м,** назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – **одноэтажное кирпичное здание насосной станции по перекачке 45 м³ воды в час. Адрес:** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/20, насосная станция ВКХ. **Информация о земельном участке:** расположен на земельном участке с кадастровым номером **321850100003009674** общей площадью **0,6752 га** – для строительства и обслуживания автодорог промышленной площадки (для размещения объектов автомобильного транспорта). **Право аренды. Адрес (местоположение):** Гомельская обл., Жлобинский р-н, г. Жлобин, пр-д Красный, 2/1 (земельный участок № 2). **В состав лота входит:** насос СЖ-45/30 (инв. № 142-42633), насос СЖ-160/45 (инв. № 142-42753), бетонный забор (инв. № 120-2096-1), ограждение промплощадки (инв. № 120-2019-5), металлические ворота п.10 5.5х2 (инв. № 120-0020), кран консольный (инв. № 150-52270), электротельфер (инв. № 142-42998), подъемник грузовой технологический (инв. № 150-5224), лифт грузовой г/п 500 кг (инв. № 150-52420), кран-балка, г/п до 1 т (инв. № 150-5237); (инв. № 150-52390); (инв. № 150-52400); (инв. № 150-52380), индивидуальный тепловой пункт № 1 для приготовления ГВС с прибором автоматического регулирования (инв. № 143-5050), центральный кондиционер КТ-30 (инв. № 142-4816), распределительный пункт ЩО-64 (инв. № 141-4377), пункт распределительный (инв. № 141-4311); (инв. № 141-4314); (инв. № 141-4322); (инв. № 141-4323); (инв. № 141-4324); (инв. № 141-4325); (инв. № 141-4326); (инв. № 141-4328); (инв. № 141-4330); (инв. № 141-4331); (инв. № 141-4332); (инв. № 141-4378); (инв. № 141-4379); (инв. № 141-4381), ворота в приготовительном цеху (инв. № 120-2111).	**2 789 724,40**	139 486,22

Продавец: ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин, 247210, г. Жлобин, проезд Красный, 2. **Порядок ознакомления с имуществом осуществляется по контактному тел.:** 8 (044) 797-88-07 заместитель директора по техническим вопросам – Галактионов Виктор Владимирович. Шаг аукционных торгов – 5 %. Для участия в аукционе необходимо: 1) Оплатить задаток на расчетный счет Продавца (ОАО «БЕЛФА» г. Жлобин): р/с BY76 BELB 3012 0114 1501 7022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, БИК BELBBY2X, УНП 400076540, назначение платежа – задаток за участие в аукционных торгах по лоту № (задаток для участия в аукционе перечисляется до подачи заявления). 2). Подать заявление организатору аукциона по установленной форме с приложением необходимых документов можно с 6 августа 2022 г. по адресу: г. Гомель, ул. Гагарина, 20, 2-й этаж, каб. «Эксперт-Услуга» в рабочие дни с 09.00 до 13.00 и с 14.00 до 16.00 прием заявлений для участия в аукционе заканчивается 2 сентября 2022 г. в 16.00 включительно. **Заявления, поступившие после установленного срока, не принимаются. Организатор аукциона вправе отказаться от проведения аукциона в любое время, но не позднее чем за три дня до его проведения. Для участия в аукционе представляются:** документ, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении, с отметкой банка; юридическим лицом или индивидуальным предпринимателем Республики Беларусь – копия документа, подтверждающего государственную регистрацию этого юридического лица или индивидуального предпринимателя, без нотариального засвидетельствования; иностранным юридическим лицом – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; иностранным индивидуальным предпринимателем – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; представителем юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная в установленном законодательством порядке (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); представителем гражданина или индивидуального предпринимателя Республики Беларусь – нотариально удостоверенная доверенность; представителем иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованная в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык. При подаче документов заявитель (его представитель) предъявляет документ, удостоверяющий личность, а руководитель юридического лица – также документ, подтверждающий его полномочия (приказ о назначении на должность руководителя, или заверенную выписку из решения общего собрания, правления либо иного органа управления юридического лица в соответствии с учредительными документами, или трудовой договор (контракт), или соответствующий гражданско-правовой договор, или иные документы в соответствии с законодательством).

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только единственным участником, объект аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) %. Участник торгов имеет право до начала торгов письменно отозвать свое заявление на участие. Неявка участника торгов на торги признается отказом от участия в торгах. В этих случаях сумма внесенного им задатка возвращается Продавцом торгов в течение 5 (пяти) рабочих дней со дня проведения торгов. Победителями торгов будут признаны участники, предложившие более высокую цену. Лица, являющиеся победителями торгов, обязаны: произвести оплату услуг (вознаграждение) за организацию и проведение торгов, затраты за публикацию в газете «Звязда» в течение **3 (трех) рабочих дней** с момента подписания протокола; заключить договор купли-продажи в течение **10 (десяти) календарных дней** от даты подписания протокола о результатах аукциона; оплатить приобретаемое имущество согласно срокам договора купли-продажи до **30 (тридцати) календарных дней** с момента подписания договора купли-продажи. Задатки, уплаченные участниками аукциона, ставшими победителями, будут учтены в счет исполнения обязательств по договору купли-продажи. Проводится аукцион в соответствии с Положением Открытого акционерного общества «Гомельоблреклама» филиал «Эксперт-Услуга» о порядке организации и проведения аукционов по продаже имущества и права на заключение договоров аренды нежилых помещений (их части). **Предоставляется рассрочка платежа для лотов №№ 1, 2, 4 в соответствии с действующим законодательством РБ. Порядок оформления участия в аукционе, в том числе документации, необходимой для регистрации участника торгов, порядок проведения аукциона размещены на официальном сайте Организатора торгов – www.gomeloblreklama.by, www.expert-usluga.by, раздел «Аукционы». Дополнительная информация по контактным телефонам Организатора аукциона: 8 (0232) 23-23-54 (тел./факс), 23-23-56, 8 (029) 651-22-19, 8 (029) 126-66-62, 8 (044) 599-18-16.**

НА БЕЛАРУСКАЙ ВУЛІЦЫ... З ПЕРАМЕНАМІ

Мінчанін расказаў, як за 27 гадоў перапіскі з чыноўнікамі дабіўся капрамонту дома і не толькі

Тэма капітальнага рамонту хваравітая для многіх. З аднаго боку, гараджанам даводзіцца гадамі чакаць сваёй чаргі. З другога, дачакаўшыся, цярпець нязручнасці з-за часовай разрухі, падчас замены камунікацый. А потым яшчэ і вылоўліваць будаўнікоў, каб тыя выправілі розныя дэфекты. Аляксандру Пратасевічу 66 гадоў. Большую палову з іх ён жыве ў цэнтры Мінска на вуліцы Беларускай. Кажа, што ў кватэры, якая належыць яго маці, 27 гадоў працякаў дах. Камфортна стала жыць толькі сем гадоў таму, калі пасля 20 гадоў скаргаў і хаджэнняў па кабінетах чыноўнікаў у доме № 14 нарэшце зрабілі капітальны рамонт.

«Налічыў у кватэры пяць сартоў цвілі...»

Сустракаемся з Аляксандрам Пратасевічам побач з трохпавярховым домам на два пад'езды 1947 года пабудовы. Мужчына распавёў, што яшчэ ў 1988 годзе, калі ён з бабуляй і маці пераехаў сюды жыць, гаварылі аб тым, што будынак пойдзе пад знос. Але ішлі дзесяцігоддзі, ніхто нічога не рабіў, і дом працягваў ператварацца ў руіны. «Ніхто нават падтрымлівальнага рамонту праводзіць не збіраўся — жывіце як хочаце. Камуналку ж мы плацілі, як усе. За 27 гадоў, што цёк дах, прыйшло ў аварыйны стан столевае перакрыццё над нашай кватэрай. Пасля дажджу ў нас заўсёды была мокрая столь, а ўзімку ды міжсезонне — сырасць і халадэча. Ад павышанай вільготнасці з'явілася цвіль пяці сартоў, гэта я так налічыў, можа, і больш, што, пагадзіцеся, не вельмі добра для здароўя. Мая бабуля-інвалід цяжка захварэла, у яе была вострая ныračная недастатковасць, памерла тут ад невыносных умоў жыцця. Мая маці — гаспадыня гэтай кватэры — таксама мае інваліднасць 2-й групы, ды і я багатырскім здароўем не адрозніваюся».

Баяцца дажджоў перасталі толькі сем гадоў таму, пасля таго як быў цалкам заменены дах. «20 гадоў я дабіваўся гэтага капрамонту, — працягвае Аляксандр Пратасевіч. — У каго толькі не быў на прыёме, столькі скаргаў напісаў у розныя інстанцыі. Дапамогу ж атрымаў толькі ад тагачасных старшыні Мінгарвыканкама і памочніка прэзідэнта — галоўнага інспектара па Мінску. Калі б яны не далі распараджэнне ЖКГ, не было б гэтага капітальнага рамонту. Я ўсё жыццё хадзіў бы і скардзіўся і нічога б не дабіўся».

У 2015 годзе абноўлены дом быў здадзены. «Думаў, нарэшце адпачну, але знайшоў па доме 40 недахопаў. І вымушаны быў працягваць пісаць скаргі — сем гадоў ужо цягнецца гэта цяжба пасля капрамонту. Практычна ўсе недахопы будаўнікі ўжо выправілі. Але ведалі б вы, чаго мне гэта каштавала...»

Паводле слоў **начальніка аддзела капітальнага рамонту КУП «ЖКГ Ленінскага раёна г. Мінска» Ларысы СЁМЧЫК**, усе заўвагі Пратасевіча, якія былі рэальна абгрунтаваныя, ужо ўстаранілі. «Акрамя тых пытанняў, якія ён задаваў па рамонце кватэры, дзе жыве. Ён піша, скардзіцца, а сам не дае доступ для таго, каб мы завяршылі там работы». Пры гэтым суразмоўніца адзначыла, што «нічога там складанага і страшнага не было. Якія там недаробкі? Дзесьці штосьці падцякала — загерметызавалі. Дзесьці яшчэ штосьці больш-менш падправілі. Усё, што трэба было зрабіць па капітальным рамонце, у доме зроблена. І нават больш. Падчас правядзення капрамонту гэтага дома ўжо была адменена цеплавая мадэрнізацыя, але мы і яе зрабілі. Дах у яго не цячэ, фасады зрабілі, трубы ўсе памянялі. Што яшчэ?..»

«Зараз пакажу вам яшчэ адзін вынік маіх клопатаў, — кажа Аляксандр Пратасевіч і просіць па тэлефоне, каб жыхар кватэры № 2 Аляксандр Адамушка вынес ключ ад падвала. — Толькі пасля таго, як я скадзіў у свой час на прыём да старшыні Камітэта дзяржкантролю, зрабілі гідраізаляцыю падвала першага пад'езда, дзе жыве Адамушка. У яго кватэра на першым паверсе. Да рамонту ў падвале пастаянна падымаліся грунтавыя воды. Там пасля дажджоў утваралася лужына сантыметраў 17 глыбінёй. У выніку — пераўвільгатненне, цвіль, першы паверх пайшоў трэшчынамі. І нікому ў ЖКГ да гэтага ніякай справы не было. Яны закідвалі нас адпіскамі. Маўляў, усё там у парадку».

Як адзначыла Ларыса Сёмчык, гідраізаляцыя падвала не прадугледжвалася капрамонтам. Яе зрабілі пазней у межах бягучага рамонту пасля скаргаў Пратасевіча па даручэнні Камітэта дзяржкантролю.

Уладзімір ІВАНОЎСКІ, дырэктар ДП «ЖЭУ № 3 Ленінскага раёна г. Мінска», патлумачыў, што дом № 14 стаіць на падмурку з цэглы. Таму, магчыма, грунтавыя і дажджавыя воды праз яе прасочваліся. «Швы ж цэглы старыя, уяўляеце, калі будаваўся гэты дом... Пасля таго як паклалі гідраізаляцыйны слой на падлозе і на сценах падвала, а звонку дома ўстанавілі латкі для адводу дажджавой вады, там цяпер нідзе не падцякае. Апошні раз мы былі з Энерганаглядам два тыдні таму».

Разам з тым жыхары дома не разумеюць, чаму будаўнікі не паклалі гідраізаляцыйны слой па ўсёй плошчы падвала. «Відаць, вырашылі сэканоміць, — кажа Аляксандр Пратасевіч. — Фактычна гэтыя недаробленыя шэсць квадратных метраў даюць падняцца грунтавым водам, якія цякуць да электрашчытавой...»

«Калі б усе сумленна выконвалі сваю работу, мы б жылі значна лепей»

«Вось, бачыце, некалькі рашотак, якія прыкрываюць водаадводныя латкі, не замацаваныя. Іх жа могуць скрасці, — працягвае экскурсію вакол дома Аляксандр Пратасевіч. — Ці вось, паглядзіце, які асфальт перад домам — латка на латцы. Тут першапачаткова тратуар павінен быў быць выкладзены пліткай. Потым, відаць, вырашылі сэканоміць. На маіх вачах прыязджаў самазвал з асфальтам. Замест таго, каб прыбраць стары асфальт, зрабіць падсыпку, утрамбаваць і толькі пасля гэтага класці новае пакрыццё, яны паклалі яго кавалкамі. У выніку на месцы стыкаў ужо шчыліны па пары сантыметраў. Я прасіў: «Замяніце асфальт». У адказ пачуў, што ў планах гэта не стаіць, бо ён у нармальным стане. Ці яшчэ... Калі пракладвалі новую ветку цеплацэнтралі, ні апор тут не было, ні ізаляцыі ўчасткаў спалучэння, і да даху яна не мацавалася. Кінулі і сышлі. Пры наступленні халадоў пачалася б вялікая цепластрата. Вядома, я пачаў скардзіцца. Толькі пасля маіх шматразовых звароташ у органы нагляду былі пабудаваны рыштаванні, і ўжо ўсё замацавана і ізалявана. Такое адчуванне, што работнікі ЖКГ наш дом лічаць абузай, прама пра гэта ніхто не кажа, але даюць зразумець сваёй рэакцыяй на мае законныя патрабаванні належна яго абслугоўваць. Практычна на ўсе мае заўвагі яны пішуць адзін адказ: «Парушэнняў не ўстаноўлена». (**Начальнік аддзела па рабоце са звароташ грамадзян КУП «ЖКГ Ленінскага раёна г. Мінска» Яніна АКУЛІЦКАЯ** пацвердзіла, што Аляксандр Пратасевіч піша вельмі шмат звароташ у розныя інстанцыі, за мінулы год ад яго ажно 76 заяў. «Па шэрагу звароташ у нас спынена з ім перапіска, бо яны неабгрунтаваныя, паўторныя, няма пацвярджальных фактаў».) Калі я месяц не плачу за камуналку, я ўжо злосны неплацельшчык. Аж да таго, што маю маёмасць могуць звярнуць у даход дзяржавы ў парадку пагашэння доўгу. А тое, што яны дзесяцігоддзямі не выконваюць належна сваю місію, гэта, атрымліваецца, нармальна?..»

Пацікавілася ў Аляксандра Пратасевіча, ці не шкада яму ўласнага часу на тое, каб пісаць скаргі і хадзіць па кабінетах чыноўнікаў? На што мужчына адказаў, што проста не можа прайсці міма, калі штосьці не так, — такі ўжо ён чалавек. «Кантроль за выкананнем абавязкаў службовых асоб ужо як другая служба ў мяне. Хоць мне за гэтыя клопаты ніхто не плаціць. Як бачыце, дзякуючы майму ахвярнаму змаганню за справядлівасць на працягу стольких гадоў дом быў прыведзены ў належны стан. У Хемінгуэя ёсць кніга «На Заходнім фронце без перамен». Дык вось на Беларускай вуліцы перамены да лепшага ёсць. Але яны чамусьці з'яўляюцца не па ініцыятывае тых, хто абавязаны гэтыя перамены ўчыняць для прыросту агульнага дабрабыту. Мы, жыхары, іх робім самі пры іх вымушаным удзеле. Калі я іх прашу штосьці зрабіць, яны міма вушэй прапускаюць. Але калі загад далі чыноўнікі вышэйшага рангу, ужо не могуць не выканаць маю просьбу».

«Хацелі, каб наш дворык хоць крыху нагадваў Версаль»

Аляксандра Пратасевіча і Аляксандра Адамушку аб'ядноўвае тое, што абое хочуць зрабіць жыццё больш камфортным і прыгожым. Кожны гэта робіць так, як можа. Першы піша звароты ў інстанцыі. І, што б хто ні казаў, хоць і не адразу, але дабіваецца перамен да лепшага. Другі ўкладвае ў перамены ўласныя грошы.

«Добра, што вы не бачылі наш двор адразу пасля капрамонту... — кажа Аляксандр Пратасевіч. — Мы ўласнымі сіламі тэрыторыю побач з домам з жудаснай памыйніцы, якую пакінулі пасля сябе будаўнікі, ператварылі ў культурны еўрапейскі падворак. Абгарадзілі задні дворык кованай чыгуннай агароджай з брамкай, жонка Аляксандра Адамушкі не лянуецца, штогод высаджвае тут кветкі».

— Раней тут прама ў мяне пад акном на 17 кватэр стаяла 12 страшных, іржавых сметніц, — дадае Аляксандр Адамушка.

— Навошта столькі? — здзіўляюся.

— Відаць, за тое, што ён *(указвае на Пратасевіча)* скаргі пісаў. Дзякуючы сумленнасці і праўдалюбству гэтага чалавека, які апантаны прынцыпамі выканання сацыяльнай справядлівасці, тут адбываюцца нейкія паляпшэнні, за якія мы яму ўдзячныя. Бачыце, жыхары дома ўласнымі сіламі зрабілі сучасную кантэйнерную пляцоўку. Закупілі неабходныя матэрыялы, толькі аднаго бетону набывалі каля 30 кубоў. Штосьці рабілі самі, на нейкія работы наймалі будаўнікоў. Ніякай самадзейнасці. Усё зроблена ў адпаведнасці з праектам рэканструкцыі, які нам зацвердзілі ў Адміністрацыі Ленінскага раёна Мінска.

«Вось, бачыце, некалькі рашотак, якія прыкрываюць водаадводныя латкі, не замацаваныя. Іх жа могуць скрасці...»

— Аляксандр Мікалаевіч сціпла не кажа, што ўсе матэрыялы ён набыў за свае грошы, — удакладняе Аляксандр Пратасевіч. Малюнак на сцяне дома з'явіўся таксама дзякуючы Аляксандру Адамушку. Ён дамовіўся з паслом Бразіліі, каб наш дом уключылі ў праект вулічнага мастацтва «VULICA BRASIL».

— Мурал маляваў мой добры знаёмы мастак Сяргей Русак з Ліды, кажа Аляксандр Адамушка. — Я яшчэ прывёз пару вялікіх гліняных амфар. Хацелася, каб наш дворык хоць крыху нагадваў Версаль. Але будаўнікі, калі мянялі старую цеплацэнтраль на новую, пашкодзілі іх каўшом экскаватара... Калі б хоць адзін жыхар у кожным доме стварай прыгажосць не толькі ва ўласнай кватэры, але і вакол дома, то, думаю, людзі б хадзілі менш панурымі і ўсмешка б часцей з'яўлялася на нашых тварах.

«Пасля капрамонту старая кантэйнерная пляцоўка, канешне, не адпавядала прыгожым фасадам дома, — кажа **старшы майстар ДП «ЖЭУ № 3 Ленінскага раёна г. Мінска» Марынэ ПЕТРАСЯН.** — На маім участку, напрыклад, 88 дамоў, усе дваравыя тэрыторыі адразу добраўпарадкаваць за кошт бюджэту немагчыма. Чарга б да іх дайшла сто працэнтаў, бо штогод у нейкім доме кантэйнерную пляцоўку абнаўляем. Але Беларуская, 14 у графіку не была менавіта ў той год, калі яны хацелі. Аляксандр Адамушка падышоў да мяне і сказаў, што працуе ў сферы будаўніцтва і хацеў бы зрабіць добраўпарадкаванне за свае грошы. Ён наогул малайчына, купіў там кватэру зусім нядаўна і адразу ж пачаў дзейнічаць. Усё зрабілі жыхары. Мы толькі дапамаглі ім разбурыць старую бетонную кантэйнерную пляцоўку, вывезлі ўсё смецце, утылізавалі яго. Прывозілі грунт, каб яны садзілі тое, што хацелі. А таксама падпраўлялі, дзе ў іх штосьці не атрымлівалася. Каб горад прыняў гэту кантэйнерную пляцоўку, каб яна адпавядала стандартам, на іх бетонную крошку за сродкі бюджэту паклалі асфальт. У нас у многіх дварах жыхары ствараюць прыгажосць.

Мы падтрымліваем такія ініцыятывы, чым можам, дапамагаем. Прыемна мець справу з людзьмі, якія хочуць жыць у чысціні».

Надзея ДРЫНДРОЖЫК, фота аўтара.

P. S. Падчас падрыхтоўкі матэрыялу я паразмаўляла з многімі службовымі асобамі. Большасць ставіцца да бясконцых скаргаў Пратасевіча не надта станоўча. І толькі старшы майстар агучыла думку, якую я ўжо неяк закрадала ў адным са сваіх ранейшых матэрыялаў. Усё ж такі «часам Пратасевіч скардзіцца па справе. Я нават радуюся такім яго заявам, якія падказваюць, на што звярнуць увагу на сваім участку, што можна палепшыць у сваёй рабоце». Дарэчы, зварот Аляксандра Пратасевіча натхніў мяне на тэму для чарговага матэрыялу. Хочацца разабрацца, чаму ўсё ж такі мы не можам з першага разу зрабіць якасны капрамонт, бездакорна ўзвесці новы дом, пабудаваць дарогу, якую не трэба будзе бясконца рамантаваць. Чаму замест таго, каб марнаваць час на выпраўленне недахопаў, адразу ўсё не зрабіць так, каб камар носу не падтачыў?

Каментарый у тэму

Паводле слоў **намесніка начальніка Інспекцыі Дэпартамента кантролю і нагляду за будаўніцтвам па г. Мінску Паўла ДРАЗДОВА**, у параўнанні з мінулым годам сёлета колькасць звароташ у Дзяржбуднагляд па якасці работ пры капрамонце зменшылася (хоць у тым ліку з прычыны змяншэння колькасці аб'ектаў, якія рэгіструюцца ў інспекцыі). «Мы рэагуем на звароты грамадзян датычна фактаў парушэнняў праекта, тэхналогіі правядзення работ, у тым ліку даём прадпісанні на ўстараненне парушэнняў, штрафуем парушальнікаў. Пасля прынятых мер заўвагі, як правіла, устараняюцца. Асноўная прычына фактаў няякаснага правядзення работ на аб'ектах капрамонту — тое, што падрадныя арганізацыі не забяспечваюць аперацыйнага кантролю якасці работ і не прытрымліваюцца тэхналогіі іх выканання. Гэта сведчыць аб недастатковым кваліфікацыйным узроўні як саміх падрадных арганізацый, так і іх работнікаў, а таксама аб незабеспячэнні належнага тэхнічнага і аўтарскага нагляду».

Шаноўныя чытачы, калі і ў вас ёсць пытанні, якія хвалююць, пішыце! Паспрабуем разабрацца ў праблемнай сітуацыі разам. Наш паштовы адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а; электронны адрас для звароташ — zvarot@zviazda.by.

Наш культурны асяродак
ЖЫРАНДОЛЯ
Выпуск № 67 (593)

СОНЦА МАЛАДЗІКОВАЕ І ПЕРАБЛЫТАНЫЯ СТАРОНКІ

Таямніцы першай беларускай кнігі

Сёння важная дата для беларускай культуры: 505 гадоў таму на свет з'явілася першая беларуская друкаваная кніга, «Псалтыр» Францыска Скарыны. Выданне, якое пабачыла свет у Празе 6 жніўня 1517 года, лічыцца першай кнігай, надрукаванай на мове ўсходнеславянскай групы народаў.

Для нас знакава, што, лічыце, роўна праз чатырыста гадоў пасля гэтай падзеі, з'явіўся на свет і першы нумар газеты «Звязда». Роднай газеты, якая выдаецца на роднай мове Францыска Скарыны.

Давайце ўспомнім некалькі цікавых фактаў пра першую беларускую кнігу.

Гэта падручнік

Гэта была не проста кніга — а падручнік. «Псалтыр» лічыўся кнігай універсальнай, якая змяшчае разнастайныя веды. Скарына пісаў: «Псалом есць... дзецям малым да ўсякае добрае навукі, дарослым памнажэнне ў навуцы, мужам моцнае зацвярджэнне...»

Выдавец лічыў, што, чытаючы «Псалтыр», чалавек вывучыць граматыку, навучыцца не толькі светапоглядным ісцінам, але і красамоўству. Недарэмна «Псалтыр» — адзіная кніга, якую Скарына перавыдаваў двойчы.

У выданні пераблытана нумарацыя

Упершыню ў кірылічным кнігадрукаванні Скарына ўжыў фаліяцыю, гэта значыць паслядоўную нумарацыю лістоў. Раней калі і ставіліся нумары, дык на асобныя сшыткі. У Псалтыры нумары стаяць на тытульным баку кожнага ліста, унізе справа. Магчыма, менавіта таму, што справа была новая, нязвыклая, у «Псалтыры» пераблытаныя нумары старонак: на 38-й значыцца 30-я. Магчыма, гэта звязана з тым, што нумары прастаўляліся чэшскімі друкарамі, якія не ведалі славянскіх лічбаў. Бо лісты Скарына нумераваў не арабскімі лічбамі і нават не рымскімі, а кірылічнымі, гэта значыць, літарамі алфавіта.

Рарытэт ледзь не згубіўся

Першая беларуская кніга лёгка магла не дайсці да нас! У 1776 годзе пецярбургскі кнігагандляр Вогак набыў канвалют — так называюць кнігу, дзе пад адной вокладкай сабрана некалькі выданняў. Там было шэсць пражскіх выданняў Скарыны і ўрывак з «Псалтыра». Але аб'ява аб знаходцы ў навуковым свеце прайшла амаль незаўважанай, а канвалют згубіўся. У 1860-х гадах на Ніжагародскім кірмашы «Псалтыр» купіў мецэнат Хлудаў. Пасля гэтага і даведаўся пра першую ўсходнеславянскую друкаваную кнігу навуковы свет.

«Псалтыр» трэба складаць як пазл

Справа ў тым, што вядомы толькі два экзэмпляры першай беларускай друкаванай кнігі. Абодва захоўваюцца ў Расіі: адзін — у Дзяржаўным гістарычным музеі, другі — у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы. І абодва асобнікі няпоўныя! У адным няма пачатку, у іншым — канца. Каб уявіць сабе кнігу цалкам, трэба абодва экзэмпляры сумясціць.

Невядома, якая старонка была першай

Да гэтага часу застаецца загадкай, якая ж старонка была ў скарынінскім «Псалтыры» самай першай? Справа ў тым, што першы ліст адарваўся і захоўваўся асобна. Пры рэстаўрацыі яго падклеілі, але ёсць версія, што не тым бокам. На адной старонцы ліста — гравюра з радаводным дрэвам Ісуса Хрыста, на другім баку — гравюра з выявай цара Давіда і назва кнігі. Магчыма, яна і з'яўляецца першай, бо менавіта біблейскі цар Давід — аўтар псалмоў.

Ці быў Скарына мастаком?

Лічылася, што Францыск Скарына сам афармляў свае кнігі, ну ці па яго малюнках рабілі гравюры. Але навукоўцы сцвярджаюць, што нават у самым першым выданні, як і ў наступных, друкары пражскай друкарні выкарыстоўвалі гравюры з больш ранніх выданняў. Напрыклад, гравюра з «Псалтыра» з выявай радаводу дрэва Ісуса Хрыста, аказваецца, надрукаваная з той самай дошкі, што была выкарыстана ў пражскім выданні 1498 года.

Загадкавы сыгнет

Менавіта ў «Псалтыры» ўпершыню з'яўляецца выдавецкі знак Скарыны, які аб'ядноўвае сонца і паўмесяц. Што ж азначае гэтае «сонца маладзіковае»? Ёсць версія, што Скарына абраў гэты знак у сувязі са сваім днём нараджэння. Бо месяц, які «наплывае» на сонца, — сімвал сонечнага зацьмення. Беларускі мастацтвазнаўца Мікалай Шчакаціхін устанавіў, што 6 сакавіка 1486 года сонечнае зацьменне назіралася ў Полацку. Магчыма, менавіта ў той дзень у сям'і купца Лукі і нарадзіўся наш будучы першадрукар.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

«Баяўся, што прыйдзецца ў незнаёмым вялікім лесе заначаваць...»

У Смольні святкуюць юбілей першай сустрэчы Купалы і Коласа

Сёння ў адным з філіялаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа — цікавая падзея... Літаратурна-музычнае свята «Туды, дзе неба з долам абняліся як браты...», прымеркаванае да 110-годдзя першай сустрэчы народных паэтаў Беларусі Якуба Коласа і Янкі Купалы.

Купала і Колас у нашым уяўленні заўсёды стаяць разам. Нядзіўна: яны нібыта дапаўняюць адзін аднаго, ствараючы вобразны беларускі сусвет. Купала — неба, Колас — зямля... Аднолькава адданыя свайму народу і таленавітыя... А яшчэ аднолькавыя ініцыялы псеўданімаў, самі псеўданімы сугучныя. Нават нарадзіліся ў адзін год.

А вось сустрэліся не адразу... Хоць завочна былі знаёмыя даўно. Гістарычнае спатканне адбылося 28 ліпеня 1912 года ў Смольні пад Мікалаеўшчынай.

Смольня — гэта здзейсненая мара героя «Новай зямлі», якія марылі пра ўласны куток... Міцкевічы змаглі набыць сваю хату ў 1910 годзе, праз 8 гадоў пасля смерці бацькі Якуба Коласа, Міхала. Жылі тут маці песняра Ганна Юр'еўна, дзядзька Антось, сёстры Міхаліна, Алена, Марыя, браты Уладзя, Міхась і Юзік. Зрэшты, пакупка была вымушаная — у вёсцы Мікалаеўшчына, дзе Міцкевічы жылі дагэтуль, здарыўся страшны пажар, згарэла трыста дваро́ў... Хату ў Смольні пабудавалі «эканомным чынам»: дзядзька Антось знайшоў у вёсцы Яршы, што каля вытоку Нёмана, будынак на продаж — двухкласавую царкоўнапрыходскую школу. Разабралі тую школу, звязалі з бярвенняў платы, і родны Нёман даставіў пакупку проста на месца.

А сам Якуб Колас, калі будавалася хата, сядзеў у мінскай турме, куды трапіў за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе. Прыехаў у Смольню ўпершыню 19 верасня 1911 года. Усё падалося бедным, запусцелым... Таму паэт, каб упрыгожыць пейзаж, нават пасадзіў на сядзібе ліпы — яны растуць і дасюль.

«Асабістае маё знаёмства з Янкам Купалам адбылося летам 1912 года, — распавядаў Якуб Колас. — Вясною гэтага года я жыў у свайго таварыша настаўніка ў Беларуччы — 25 вёрст ад Мінску. У гэтай школе, як перадаваў мне таварыш, калісьці вучыўся Янка Купала. Так гэта было ці не так (я ў Купалы не правяраў), але гэты факт гаворыць ужо пра тое, наколькі стаў вядомы Купала і яго паэзія ўжо ў той час... Купала спецыяльна прыехаў пабачыцца са мной».

Сустрэча адбылася праз доўгі час пасля завочнага знаёмства яшчэ і таму, што Колас толькі што вызваліўся з турмы і знаходзіўся пад пільным наглядам паліцыі. Рабіць візіты і прымаць гасцей было небяспечна... «Обстоятельства моей жизни складывались так, что я не мог поехать к Янке Купале, чтобы встретиться с ним наедине. Поехать как к другу, которого я глубоко полюбил за его произведения. Я был под неусыпным оком полиции».

Пра гэтую знакавую сустрэчу напісана вельмі шмат... Давайце ўспомнім некаторыя цікавыя факты.

ПЕШКІ АД СТОЎБЦАЎ

Дарога для Янкі Купалы далася няпроста...

«Пазваў мяне ў госці Якуб Колас. Грошай, як заўсёды, у мяне не было, каб наняць балагола, і я рашыў са станцыі Стоўбцы да вёскі ісці пехатою. Іду, іду, ужо і цямнець пачынае, кругом лес. Няма ў каго спытацца дарогі. Баяўся, што прыйдзецца ў незнаёмым вялікім лесе заначаваць, а тут і есці хочацца. Раптам павеяла вільгаццю, і я ўспомніў, што, па словах Якуба Коласа, Мікалаеўшчына стаіць на беразе Нёмана. Вось і пайшоў я ў гэтым напрамку. Так і дайшоў шчасліва да самай Коласавай хаты».

Словы тыя пацвярджае сам Колас у лісце да Льва Клейнбарта:

«Вёрстаў восем прайсці трэба было лесам. Раздзівілаўскія лясы вельмі вялікія, і свежаму чалавеку ў іх лёгка згубіць дарогу. Ведаючы, што Мікалаеўшчына стаіць на Нёмане, Купала кіраваўся тым меркаванем, што ў бок Нёмана павінна быць больш вільготнасці ў паветры, якую ён і адчуваў, і шчасна дайшоў да месца прызначэння, нягледзячы на начную пару і незнаёмства з мясцовасцю».

КОЛАСА НЕ БЫЛО ДОМА

Прыйшоў Купала лясамі-туманамі, а Коласа на месцы і няма!

У Смольні захаваўся стол, за якім сядзелі класікі.

«Якраз гэтымі днямі я быў у вёсцы ў аднаго са сваіх прыяцеляў. І раптам звяртаецца адна з сясцёр, усхваляваная, якая стамілася ад хуткай хады, і адразу з запалам сказала: «Да цябе прыйшоў Янка Купала!» Гэтыя словы моцна ўразілі мяне, я зараз жа развітаўся з прыяцелем і хутка накіраваўся да дома на сустрэчу з паэтам, якога я ведаў даўно, але ні разу яшчэ не бачыў, якога так моцна хацелася ўбачыць. Купала сядзеў за сталом, убачыўшы мяне на парозе дома, ён не спяшаючыся падняўся з месца, і накіраваўся насустрач мне. Дабрадушная ўсмешка, ясны малады твар, вясёлыя светла-карыя вочы з ледзь улоўнай хітрынкай — такі быў у маіх вачах Янка Купала. Такі жыве ён і дагэтуль у самым запаветным кутку маёй памяці...»

ЦЕСНЫЯ ТУФЛІ

Вось вярнуўся Колас бегма дадому, сустрэць дарагога госця... Прывіталіся...

І заўважае Колас, што госць неяк дзіўна ходзіць, кульгае... Што здарылася?

Аказалася, што Купала, які быў яшчэ тым франтам і, наколькі дазвалялі сродкі, сачыў за модай, набыў сабе шыкоўныя туфлі. Падумаеш, трошкі зацесныя, пацерпіць! Зразумела, у госці да паважанага калегі Купала абуў абноўку.

Але на туфлі грошы знайшоў, а на рамізніка — не. Пакуль блукаў у Радзівілаўскіх лясах, ногі ўшчэнт змыліў. Вось, пакуль Коласа не было і госць застаўся ў хаце сам-насам, ён туфлі і зняў... А як Колас падышоў — зноў абуў. Ды спяшаўся і ўдзеў не на тыя ногі.

Тады Колас зноў цікуе: што ж госць гэтак сціпла за сталом трымаецца? Чарку толькам не падыме, страву сабе не накладзе...

Аказалася, што і новы піджак хоць модны, а зацесны, рукі не выцягнуць.

Кажуць, пасля гасцявання ў Коласа Купала некалькі дзён хадзіў ці ў тапках, ці басанож.

ЗУХАВАТАЕ СПАБОРНІЦТВА

На карцінах, якія адлюстроўваюць векапомную сустрэчу класікаў, тыя сціпла сядзяць за сталом за кубкамі з гарбатай.

Ды ганьба беларускай хаце, дзе доўгачаканага здарожанага госця частуюць за пустым сталом адным падфарбаваным кіпнем!

Зразумела, гаспадары вывалілі на стол усё, што мелі... І шкварка была. І чарка. І зухаватае спаборніцтва, хто каго пера́ле. Купала, па прызнанні Коласа, перамог.

«Пасля выпіўкі пайшлі спаць у гумно на гарох», — сціпла занатоўвае Колас.

А назаўтра маладыя паэты — абодвум каля трыццаці, самы росквіт — пайшлі цягацца па наваколлі. У мястэчку Новы Свержань завіталі да знаёмага ксяндза, спустошылі ягоныя запасы... Потым пайшлі на станцыю Стоўбцы, адкуль Купала мусіў вяртацца дадому, і там зноў працягнулі сваё спаборніцтва. «І, як кажуць, засталіся «і не лысымі», — пісаў Колас.

ЧАМУ МАЛА ПЕРАПІСКІ?

«Аб гэтай сустрэчы мне не раз даводзілася казаць. Але яна такая светлая, радасная, такая яркая і жывая ў маёй памяці, што і зараз хочацца сказаць пра яе некалькі слоў» — успамінаў Якуб Колас.

А вось перапіскі таго часу паміж двума класікам, аказваецца, не так і шмат!

Колас тлумачыў Льву Клейнбарту ў 1928 годзе:

«Увесь час жывем мы вельмі дружна, хоць перапіскі між намі і не было, калі не лічыць вельмі нешматлікіх лістоў, якімі абмяняліся мы за ўсё жыццё. Купала невялікі ахвотнік да перапіскі. Я, як зганьбаваны чалавек у вачах начальства, таксама стараўся пазбягаць яе. Акрамя таго, наш час слаба спрыяў правільным паведамленням па пошце».

Наступны раз класікі сустрэліся ў 1913 годзе ў Вільні, калі Купала жыў у рэдакцыі «Нашай Нівы». У час вайны згубілі адзін аднаго і да 1921 года не сустракаліся.

Ну а потым, як успамінаў малодшы сын Якуба Коласа Міхась Канстанцінавіч Міцкевіч, «Купала быў у нашай хаце часта, і мы бывалі ў яго ў гасцях. Шмат чаго было цікавага ў іх адносінах... Купала быў вельмі далікатны чалавек, знакаміты, заўсёды з лагодным выразам твару. Ён заўсёды, калі прыходзіў да нас, нешта прыносіў — які-небудзь падарунак мне. Неяк падарыў два шыкоўныя альбомы жывёльнага свету. А мы з бацькам заходзілі да яго, калі хадзілі ў лазню Палаўскага — насупраць дома Купалы. З лазні выходзілі — і да яго. У Купалы была цэлая калекцыя гліняных чарапкоў, цэлая куча каменьчыкаў, якія ён, відаць, прывозіў з мора. І мне даставалася. Яны бавілі час звычайна ўдваіх: гулялі ў шахматы, абмяркоўвалі свае пытанні».

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ
Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

Ганна КІСЛІЦЫНА:

«Некаторыя дэталі робяць постаці пісьменнікаў бліжэйшымі»

Пра каштоўнасць слова здаўна складзена шмат прыказак і прымавак. Нездарма — дастаткова далучыцца да беларускага слова праз кнігі. Але беларуская літаратура — гэта больш чым проста прыгожае пісьменства, хоць і яно само па сабе прыцягальнае. У нашай літаратуры не вельмі шмат аўтараў, якія пісалі дзеля чыстай красы, лічыць Ганна Кісліцына, доктар філалагічных навук, загадчык аддзела тэорыі і гісторыі літаратуры Інстытута літаратуразнаўства імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Зусім не проста так літаратуру даследуюць на высокім навуковым узроўні: яна фіксуе рэчаіснасць, адпаведна, фіксавала працэсы і этапы станаўлення нашай дзяржаўнасці. У розныя часы даследчыкі звярталі ўвагу: каб лепш разумець сваю краіну, трэба чытаць яе кнігі. Пра задачы літаратуразнаўцаў і рысы дзяржаватворчасці ў літаратурным працэсе была наша размова:

1. ВЫСОКІЯ МЭТЫ

— Калі паглыбіцца ў гісторыю беларускай літаратуры, то будзе відавочна, што пісьменнікі ў нас ніколі не кіраваліся жаданнем толькі развесяліць ці выхаваць. Кожны раз, калі яны браліся за пяро, то мелі больш значныя мэты. Ужо ў першых палемічных творах — рэлігійных і свецкіх — паўставалі пытанні дзяржаўнасці. Чаму? Таму што пісалі іх людзі высокаадукаваныя, яны працавалі пры тых, хто трымаў уладу. Адпаведна, жылі іх зацікаўленасцямі, былі ў сферы дзяржаўных інтарэсаў. Летапісы і сказанні адлюстроўвалі, сярод іншага, узаемаадносіны паміж краінамі. Думанне на дзяржаўным узроўні ў прынцыпе характэрнае для літаратуры, і не толькі апошніх стагоддзяў. Наадварот — нашы пісьменнікі разняволіліся хіба ў XX стагоддзі: сталі думаць пра сябе як аб прыватным чалавеку, пачалі пісаць лірычныя вершы і г. д. Гэта добра прасочваецца ў кнізе Івана Саверчанкі «Міжнароднае супрацоўніцтва Беларусі», дзе ёсць глава пра знешнюю палітыку Беларусі з IX—XX ст.ст., у якой выкарыстоўваюцца літаратурныя матэрыялы. Прынята лічыць, што беларуская мастацкая літаратура вырасла з фальклору толькі ў XIX стагоддзі, хоць і да гэтага мы мелі вялікі пласт перакладных твораў. Працэс вывучэння, збірання і пераасэсавання спадчыны звязаны з дзейнасцю філаматаў і філарэтаў, якія ў свой час выбудоўвалі нацыянальны светагляд і марылі пра самастойную дзяржаву. Тыя з іх, хто прыязджаў з Вільні дадому, збіралі фальклор, запісвалі паданні. Можна казаць, што рамантызм як стыль вырас у нас з фальклору.

Пачынальнік беларускай літаратуры Францішак Багушэвіч па адукацыі быў юрыст, яго творчасць і грамадская дзейнасць будзілі самасвядомасць беларусаў, а ідэі леглі ў падмурак беларускага нацыянальна-вызваленчага руху пачатку XX ст. Вінцэсь Дунін-Марцінкевіч, які быў служачым у Мінскай крымінальнай палаце, таксама марыў пра справядлівасць у грамадстве. Кожны з нас ведае «Пінскую шляхту», дзе ёсць сцэна суда, — па сутнасці, гэта пра ўзаемаадносіны чалавека і дзяржавы. Нездарма імёны нашых класікаў згадваюцца сёння ў лекцыях па праве. Яны займаліся не толькі вершамі ці апрацоўкай фальклору, але і пісалі публіцыстычныя і літаратуразнаўчыя артыкулы. Ідэі дзяржаўнага будаўніцтва ў XX ст. знаходзім мы і ў творчай спадчыне Янкі Купалы, Якуба Коласа, Луцкевічаў, Язэпа Лёсіка, Вацлава Ластоўскага.

2. МОЎНАЯ ПРАСТОРА

— Гісторыя літаратуразнаўства Беларусі раней абапіралася выключна на тэксты, створаныя на беларускай мове. Між тым сёння ў нас ёсць усе падставы гаварыць, што і літаратурная крытыка, і літаратуразнаўства, як і прыгожае пісьменства Беларусі, заўсёды былі шматгалосныя, бо ствараліся ў краіне, дзе на працягу не аднаго стагоддзя гаварылі на розных мовах. Ігнараванне гэтага факта вяло да таго, што з поля навуковага зроку выпадалі не толькі шматлікія тэксты, але і асобныя жанры, бо беларуская мова да пэўнага часу не была мовай навукі. Асэнсаванне літаратурных працэсаў раней было ўключана ў сферу філасофіі, эстэтыкі, гістарычных штудыяў, таму, напрыклад, структура тэксту, выразныя сродкі мовы разглядаліся ў межах такіх пераважна прыкладных дысцыплін, як, напрыклад, рыторыка. Калі мы звернемся да прац 20-30-х гадоў XX стагоддзя, то зразумеем, што выбар на карысць адной мовы быў свядомы і выкліканы жаданнем стварыць нацыянальную дзяржаву.

Сёння мы павінны вярнуць тых аўтараў, якія ў нас нарадзіліся, гадаваліся, працавалі. Тым больш што суседнія дзяржавы ад нас увесь час нешта адшчыкваюць, а мы аддаём, бо напісана не па-беларуску. Але калі мы адмаўляемся ад нейкіх імёнаў, то аказваецца, што мы адмаўляемся ад нейкіх стыляў. Напрыклад, Адам Бабарэка казаў, што, калі пайсці за некаторымі навукоўцамі, якія гатовыя да нас усё цягнуць, высветліцца, што ў нас ёсць і сентыменталізм — у Дуніна-Марцінкевіча, і рамантызм — у Міцкевіча, Рыпінскага і Баршчэўскага. А калі так, то знойдзецца яшчэ і «мастацтва дзеля мастацтва» — у Купалы і Багдановіча. Сёння мы разумеем, што гэтая разнастайнасць вельмі важная, бо фарміруе погляд на нацыянальную культуру, якая насамрэч была развітой. Таму неабходна дадаваць у падручнікі імёны тых, хто пісаў на іншых мовах, пры гэтым паважаючы і ставячы сваю на першае месца.

3. УРОКІ ГІСТОРЫІ

— На лаціне былі напісаны паэмы Яна Вісліцкага і Міколы Гусоўскага. У гісторыі літаратуры 1977 года было ўсяго пару абзацаў пра гэтыя творы. Нават «Песня пра зубра» да апошняга доўгі час не лічылася часткай беларускай культуры. Надрукавалі яе ў перакладзе Язэпа Семяжона толькі ў 1968 годзе. Між тым у іх увасабляецца ідэя моцнай самастойнай дзяржавы. І вось менавіта таму такім важным з'яўляецца літаратуразнаўства: яно дае ўсведамленне пра тое, што краіна са сваёй адметнай гісторыяй — моцная краіна.

Цікавасць да літаратуры ідзе хвалямі. Увага да філалогіі ўзнікае кожны раз, калі паўстае пытанне незалежнасці дзяржавы. Так, у 20-я гады XX стагоддзя паўстаў Інбелкульт, першая беларуская навуковая арганізацыя, якая была рэарганізаваная ў Беларускую акадэмію навук. З нагоды 100-годдзя гэтай арганізацыі сёлета праводзілася шмат канферэнцый у межах Года гістарычнай памяці. З іх вынікае, што Інбелкульт сёння — гэта ўзор таго, як могуць мабілізавацца творчыя, культурныя і навуковыя асяродкі, калі перад імі стаіць задача нацыянальнага адраджэння і калі ім даецца рэальная магчымасць рэалізаваць свой патэнцыял. Рэалізаваць даўнюю мару беларусаў пра стварэнне сваёй уласнай гуманітарыстыкі. Інбелкульт — гэта сімвал таго, што ўздым свядомасці можа стварацца цуды, якім, уласна кажучы, і было з'яднанне супольнасці аднадумцаў у арганізацыю, якая стала і даследчым інстытутам, і асветніцкай установай, і прыстанішчам для творчай арганізацыі «Маладняк». Але перш за ўсё пляцоўкай, якая фарміравала вобраз самой Беларусі. Як вядома, Інбелкульт быў параджэннем уздыму нацыянальнага духу, але ў сваю чаргу ён і сам выклікаў цэнтрабежныя сілы, якія праз гэтую ўвагу да думкі і меркаванняў шырокіх мас спарадзілі веру людзей, далёкіх ад акадэмічнай навукі, ва ўласныя сілы, важнасць іх мясцовых мікрадаследаванняў і тым самым спрыялі ўздыму незвычайнай цікавасці да гісторыі, мовы і культуры краіны.

4. ВЕДАННЕ КАНТЭКСТУ

— Нешта падобнае было ў 90-я гады мінулага стагоддзя з набыццём незалежнасці. Зноў узнікла цікавасць да ўласнай культуры, да мовы. Калі нацыянальная літаратура актуалізавалася, з'явілася цікавасць да яе як да прадмета даследавання. А калі ўзнікае новы прадмет даследавання, адпаведна, узнікаюць і новыя метады даследавання. Напрыклад, беларускую літаратуру сталі больш глыбока вывучаць у кантэксце еўрапейскай. Праўда, узнікла адна праблема: вельмі хацелася знайсці паралелі з еўрапейскай літаратурай, але не заўсёды ўлічваўся кантэкст. Сёння літаратуразнаўцы працуюць у метадзе, які ўмоўна можна назваць гісторыка-кантэкстным. Гэта значыць, што мы ўлічваем не проста агульнасць сюжэта ці часу, але асаблівасці культурнай эпохі, атмасферу, асяродак, у якім пісаўся твор. Існуюць універсальныя, больш важкія рысы, чым проста падабенства.

Наш інстытут выдае шмат кніг, дзе сабраны даўнія тэксты. Зараз змяніўся фармат друкавання старых тэкстаў і падыход да іх разгляду. Мы можам паказваць тэксты на мове арыгінала ў перакладзе на беларускую і ў параўнанні з такімі ж тэкстамі на замежнай мове. Да гэтых тэкстаў літаратуразнаўцы-медыявісты робяць разгорнутыя каментарыі. Змяніўся і тып бібліяграфічных выданняў. Мы сталі вывучаць не проста тэкст, а прасочваць паралелі: чаму можам адносіць яго да беларускай культуры. Літаратуразнаўца сёння — і гісторык, і культуролаг, бо павінен улічваць кантэкст.

— Узнікаюць новыя метады, але ранейшыя трансфармуюцца. Напрыклад, біяграфічны метад — адзін з найстарэйшых. Сёння, калі мы пішам пра нейкага пісьменніка, можам узнаўляць не толькі яго гісторыю ў пераказе блізкіх і родных, як было раней, але дадаём фотаздымкі, сканы дакументаў, знойдзеных у архіве. Гэта вельмі добра ўздзейнічае на чытачоў, таму што яны разам з навукоўцамі знаходзяцца ў інтэрактыўнай працы: разумеюць, як ішла думка даследчыка, калі ён рабіў тыя ці іншыя высновы.

5. ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ КАШТОЎНАГА

— Сёння шмат цікавых маладых даследчыкаў, асабліва спецыялістаў ў гісторыі літаратуры, якія з пятэтам адносяцца да папярэднікаў. Гэта паказала і нядаўняя канферэнцыя, прысвечаная Генадзю Кісялёву, які займаўся гісторыяй літаратуры, Скарынам, XIX стагоддзем. Удзельнічалі людзі, якія сядзяць у архівах, тыя, хто можа расказаць пра мінулае ў дэталях. Распавесці, напрыклад, якой была дачка слынага беларускага драматурга Камі-ла Марцінкевіч. У яе неверагодны лёс, пра які трэба пісаць кніжку ці здымаць фільм, бо гэта гісторыя пра палымяную душу, якая шукала сябе, пра вялікае каханне, пра яе адносіны з бацькам, якія былі вельмі няпростыя. І сам Дунін-Марцінкевіч — чалавек, які прадстаўляе Мінск XIX стагоддзя. Яго тут усе ведалі, многія не любілі, таму што ён быў авантурыстам. Было шмат цікавых выступленняў, напрыклад, пра запісы Мараўскага, які апісваў Вільню XIX стагоддзя, асяродак філаматаў і філарэтаў, раскрываў прычыны канфлікту паміж імі і тагачаснымі ўладамі. Успаміны Мараўскага перакладаюцца, іх, канешне, трэба выдаць, бо гэта найярчэйшая старонка беларускай гісторыі, пададзеная яе відавочцам.

Але цяжка знайсці выдаўцоў на падобныя кнігі. Каб кніжкі раскупалі, трэба рэклама. А каб яна была, трэба, каб гэтыя імёны ведалі. Атрымліваецца замкнёнае кола. Магчыма, патрэбная серыя з невялікім тыражом, у якой бы друкаваліся важныя для нашай гісторыі дакументы, інакш потым мы зноў будзем, як і нашы папярэднікі, кожныя паўстагоддзя адкрываць адных і тых жа аўтараў. Тым больш што ёсць ахвотнікі, якія ўсё гэта перакладаюць на валанцёрскіх пачатках. Пашыраць уяўленне пра сваю літаратуру і культуру — гэта і ёсць наш абавязак перад гісторыяй, перад папярэднікамі.

Калі гаворыш пра нешта новае, то вельмі рэдка знаходзіш водгук. Мне здаецца, што казка пра курку Рабу і разбірае яечка — гэта гісторыя пра навуку. Калі людзі не ведаюць, што такое золата, то ім лепш звычайнае яйка, бо невядома, што рабіць з залатым. Тое ж самае з новымі навуковымі ведамі: не адразу зразумелая іх каштоўнасць. Патрэбна папулярызацыя. У выдавецтве «Беларуская навука» няма рэкламшчыкаў, адпаведна, усё кладзецца на плечы саміх навукоўцаў. Але праблема ў тым, што не так многа пляцовак, дзе можна расказваць пра літаратуру. Трэба, каб гэты механізм быў больш адладжаны. Так, інтэрнэт — як варыянт, але ў ім усё хутка мяняецца, шмат што можа згубіцца. Таму паперу нішто не заменіць.

6. СУВЯЗЬ З ЫШЦЦЁМ

— Сёння літаратуразнаўства трошкі іншага тыпу. Нарэшце яно стала займацца ў тым ліку пытаннямі эстэтычнымі. Напрыклад, Яўген Гарадніцкі вывучае, як зроблены твор, яго эстэтыку. Ён даследуе, напрыклад: чаму мы любім Каратквевіча? Падрабязна разбірае сістэму вобразаў, матывы, колеры. Згодна з яго высновамі, любоў да пісьменніка складаецца з таго, што менавіта такі тып вобразнасці падабаецца чытачам, такія фарбы актуальныя для тых, хто жыве на гэтай зямлі, такія гукі і наогул мелодыка тэксту. У літаратуразнаўцаў нарэшце з'явілася мажлівасць маруднага чытання — вядомы метад, каб паглыбіцца ў канкрэтны твор, а не ахопліваць літаратуру пэўнага перыяду. Так, Валер Назараў, лаўрэат Нацыянальнай прэміі па літаратуразнаўстве, напісаў кніжку пра Андрэя Мрыя. Павольнае чытанне дае магчымасць даследаваць кожнае слоўка, прасачыць, як творчасць перасякаецца з лёсам, з месцам працы, з абставінамі сям'і. Архіўныя дакументы, прыватная перапіска, інбелкультаўскія паперы дазваляюць даследчыку адкрыць не толькі новае ў змесце, але і пераасэсаваць значэнне пісьменніцкага псеўданіма.

Біяграфічны метад наогул адпавядае выклікам часу. Напрыклад, у гламурных часопісах мы бачым запыт на гісторыю лёсаў не толькі зорак, але і на прыватныя гісторыі пісьменнікаў. Хто з кім жанаты, дзе працаваў, як адпачываў, які меў дом. Як звалі сабачку Маякоўскага, які быў агульны з Ліляй Брык. Калі нехта пра гэта піша, значыць, неаму гэта цікава. І нашы літаратуразнаўцы могуць адказаць на падобныя пытанні. Сёння мы ведаем, у якія шахматы гулялі Якуб Колас з Янкам Купалам, на якім аўтамабілях іх вазілі. Некаторыя дэталі робяць постаці пісьменнікаў бліжэйшымі. Напрыклад, тое, што Колас страшэнна любіў збіраць грыбы. Гэта вельмі па-беларуску, бо збіраць грыбы — наша нацыянальнае хобі. Стварэнне чалавечых, зразумелых жыццяпісаў класікаў — гэта таксама важная місія літаратуразнаўства, якая звязвае яго з рэальным жыццём.

7. ПРЫЗНАНЫЯ АЎТАРЫТЭТЫ

— На жаль, бывае так, што вельмі таленавітыя людзі знікаюць з поля зроку. Іншым разам перачытваеш твор і не разумееш: а што не так? Чаму ніхто не гаворыць пра гэты выбітны тэкст? Усё ж зроблена ідэальна. Колькі гісторый пра тое, што рукапісы згарэлі ці на гарышчы мышы пагрызлі! Часам узнікае божая рука, якая прыводзіць да невядомага ці малавядомага тэксту нейкага даследчыка альбо папулярызатара. Так, вельмі таленавіты Анатоль Сербантовіч, практычна невядомы звычайнаму чытачу. Хоць згадваў яго ў сваім "Паэтычным слоўніку" Вячаслаў Рагойша, займаўся выданнем яго твораў Сяргей Кавалёў. Шыкоўная вобразнасць, чароўны гукапіс, зразумелыя любому беларусу тэмы. Але ўсё роўна няма народнай вядомасці, нягледзячы на тое, што былі цудоўныя апекуны ў яго творчасці. Ёсць лёс — і ўсё, што б ты ні рабіў, шырокай вядомасці не будзе. І гэта не залежыць ад якасці. Таму пісьменнікам не варта спадзявацца, што літаратуразнаўцы іх высунуць на паверхню. У гісторыі літаратуры свае законы, не ўсё залежыць ад нас. Хоць, канешне, шмат што залежыць...

Запісала Ларыса ЦІМОШЫК.

Поўны тэкст чытайце на сайце zviazda.by.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ТОРГОВ
Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП»
18 августа 2022 г. в 14.00 проводит повторные торги по продаже следующих объектов.
ЛОТ № 1. КОМПЛЕКС ИМУЩЕСТВА В СОСТАВЕ:

Наименование основных средств	Инвентарный номер
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-305, площадью – 2042,3 кв. м, назначение – Здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – Асбестоцементный склад, составные части и принадлежности – Здание асбестоцементного склада, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая	00110039
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-283, площадью – 1337,2 кв. м, назначение – Здание административно-хозяйственное, наименование – Здание бытового корпуса, составные части и принадлежности – Здание бытового корпуса, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая	00110038
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-182, площадью – 13734,0 кв. м, назначение – Здание административно-хозяйственное, наименование – Здание главного корпуса шиферного цеха, составные части и принадлежности – Здание главного корпуса шиферного цеха, три пристройки, семь складов, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00110035
Пристройка (комната мастера по отгрузке 730/с-182	00110163
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13342, площадью – 615,6 кв. м, назначение – Здание неустановленного назначения, наименование – Здание отстойника технологической воды, составные части и принадлежности – Здание отстойника технологической воды, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001004662 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00110227
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-304, площадью – 435,5 кв. м, назначение – Здание специализированное энергетики, наименование – Трансформаторная подстанция, составные части и принадлежности – Одноэтажное кирпичное здание трансформаторной подстанции, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая	00110036
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13309, назначение – Сооружение неустановленного назначения, наименование – Железнодорожные пути главного корпуса, составные части и принадлежности – Железнодорожные пути главного корпуса, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001004662 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00220028
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13404, площадью – 3230,0 кв. м, назначение – Здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, наименование – Открытый склад готовой продукции, составные части и принадлежности — Открытый склад готовой продукции, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00220029
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13311, назначение – Сооружение неустановленного назначения, наименование – Подземная станция перекачки, составные части и принадлежности – Подземная станция перекачки, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001004662 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00220027
Капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13580, назначение – Сооружение неустановленного назначения, наименование – Технический канал АЦИ, составные части и принадлежности – Технический канал АЦИ, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00220224
Пешеходный мост	00220123
капитальное строение с инвентарным номером 730/С-13582, назначение – Сооружение специализированное трубопроводного транспорта, наименование – Эстакада с трубопроводами к шламотстойнику, составные части и принадлежности – Эстакада с трубопроводами к шламотстойнику, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 724050100001000170 по адресу: Могилевская обл., Кричевский р-н, г. Кричев, ул. Зеленая, д. 4	00220225
Здание бывшего административного корпуса шиферного цеха 730/с-306	00110037
Склад для дров (пристройка) 730/с-306	00110161
Здание бойлерной (пристройка) 730/с-306	00110160
Кладовая (пристройка) 730/с-13210	00110162
Резервуар для железного купороса 730/с-13581	00220226
Насаждения ограниченного пользования	00970246
Весы ОДКТ - 200 А	640004

Наименование основных средств	Инвентарный номер
Весы ОДКТ - 200 А	640006
Весы ОДКТ - 200 А	640005
Выпрямитель для дуговой сварки ВДМ-6303С	444973
Выпрямитель многопостовой ВДМ-1202С	445218
Кондиционер Galanz	445191
Кран эл. мостовой г/п 5 т № 28-56, б/у	444100
Кран эл. мостов. (кран-балка) г/п 3 т 10-62, б/у	444101
Кран эл. мостовой № 12-68 (линия № 5)	440570
Кран эл. мостовой № 12-69 (линия № 5)	440571
Кран электромостовой № 21-99.	440297
Кран электромостовой № 22-01	440298
Кран электромостовой № 28-57	440299
Кран электромостовой магнитно-грейферный отстойника техн. вод	444981
Линия автомат. № 1, в т. ч.:	440347
Машина обмин. асбеста (линия № 1)	440336
Машина раскр. СМА (линия № 1)	440316
Мешалка (линия № 1)	440324
Переборщик (линия № 1)	440331
Рекуператор (линия № 1)	440346
Гидропуш. СМА с насос (линия № 1)	440309
Гидропушитель (линия № 1)	440314
Турбосмеситель (линия № 1)	440315
Линия автомат. № 2, в т. ч.:	440348
Машина обмин. асбеста (линия № 2)	440338
Машина раскр. СМА (линия № 2)	440317
Мешалка (линия № 2)	440325
Переборщик (линия № 2)	440332
Волнировщик № 43	445256
Машина обмин. асбеста (линия № 2)	440337
Гидропушитель (линия № 2)	440322
Линия автомат. № 3	440349
Волнировщик № 44	445257
Машина обмин. асбеста (линия № 3)	440342
Машина обминания асбеста (линия № 3)	440779
Мешалка (линия № 3)	440326
Машина раскр. СМА (линия № 3)	440318
Переборщик (линия № 3)	440333
Мегаомметр Е6-24	640663
Мегаомметр Е6-24	640662
Пылесос прoMbinui.GAS 50.1200 Вт, 50 л	445200
Расходомер РСМ-0,5.03 ДУ 100 (к-т)	640603
Регистратор РМТ69L	640223
Рекуператор (линия № 5)	440568
Рекуператор (линия № 5)	440569
Рекуператор (линия № 5)	440291
Счетчик пара измерительная система ИСТОК-ПАР-07	640639
Таль электр. каната г/п 3,2 т.	444791
Технологическая линия № 4, в т. ч.:	440303
Машина раскр. СМА (линия № 4)	440319
Мешалка (линия № 4)	440327
Переборщик (линия № 4)	440334
Увлажнитель (линия № 4)	440774
Трансформатор ТМГ 11-1250/10 (подстанция)	540152
Электротельфер 3.2 та.	440304
Электротельфер Q-3,2th	440844
Адгезиометр ПСО-5МГ4 для определения прочности сцепл. полимерн. покрытия	640504
Весы ARC-120	640164
Кондиционер Samsung	444258
Лабораторный пневматический классификатор ПК-2А	640608
Термогигрометр testo 625	640736
Шкаф сушильный	640393
Шкаф холодильный R700L	445430
Автопогрузчик TOYOTA	444925
Электропогрузчик TOYOTA	444949
Электропогрузчик TOYOTA	444951
Распределительное устройство КВ 0,4	540046
Распределительное устройство РУ 0,6 кВ	540045
Трансформатор ТМГ 11-1250/10 (подстанция)	540153
Внутриплощадочные кабельные сети 0,4 КВ отстойника технол. вод	330212
Наружные сети 0,4 КВ отстойн. техн. вод теплоснабжен., водоснабж., канализации	330213
Кабельная линия 6 кВ Ф606, Ф624 (состоит из двух кабелей)	б/н

Начальная цена продажи лота № 1 снижена на 25 % и с учетом НДС (20 %) составляет 1 534 959,00 00 (Один миллион пятьсот тридцать четыре тысячи девятьсот пятьдесят девять белорусских рублей 00 копеек), задаток 153 495,90 бел. руб. (Сто пятьдесят три тысячи четыреста девяносто пять) белорусских рублей 90 копеек.
Собственник имущества: Открытое акционерное общество «Кричевцементношифер», 213493, Республика Беларусь, Могилевская область, Кричевский р-н, Краснобудский с/с, 2, АБК в районе месторождения «Каменка», тел. +375224120909, тел. для осмотра объектов продажи +375224120914.
Организатор торгов: Унитарное предприятие по оказанию услуг «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты», г. Могилев, ул. Циолковского, 1. www.mogilev.cci.by.
Место проведения торгов: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».
Лот № 1 продается без условий на торгах в форме открытого аукциона с применением метода повышения начальной цены с шагом 5 (пять) процентов от предыдущей названной аукционистом цены. Победителем торгов признается участник, предложивший наивысшую цену.
К участию в торгах допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов в сроки, указанные в извещении, следующие документы: заявление на участие в торгах; копии учредительных документов (для юридических лиц) и свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); доверенность представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель); заявление об ознакомлении с документами, продаваемым имуществом, порядком проведения торгов; соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения торгов (в двух экземплярах); копию платежного поручения о внесении задатка, заверенную банком. Задаток перечисляется на расчетный счет унитарного предприятия «Могилевское отделение БелТПП», р/с № BY55PJCB30123018571000000933 в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 300 г. Могилев, BIC: PJCBBY2X, УНП 700016628; физическим лицам – предъявить паспорт; иные документы в соответствии с Положением о порядке организации и проведения торгов по продаже объектов, находящихся в собственности юридических лиц и индивидуальных предпринимателей Республики Беларусь, организуемых унитарным предприятием «Могилевское отделение Белорусской торгово-промышленной палаты».
Условия регистрации, участия в торгах размещены на интернет-сайте продавца по адресу: www.mogilev.cci.by.
Срок заключения договора купли-продажи между продавцом и победителем торгов (покупателем) – в течение 10 календарных дней после проведения торгов.
Срок оплаты предметов торгов на условиях заключенного договора купли-продажи.
Торги состоятся 18 августа 2022 г. в 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к.112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».
Срок подачи заявления: с момента выхода публикации настоящего извещения в рабочие дни с 9.00 до 12.00 и с 14.00 до 15.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, 1, к. 104. Последний срок подачи заявления – 17 августа 2022 г. до 12.00.
Регистрация участников торгов 18 августа 2022 г. с 13.30 до 14.00 по адресу: г. Могилев, ул. Циолковского, к. 112, Унитарное предприятие «Могилевское отделение БелТПП».
Телефоны для справок: (0222) 778042, +375296927492 (А1). Дополнительная информация размещена на сайте организатора.
Извещение о предыдущих торгах по объекту было размещено в газете «Звязда» от 25.06.2022.

ИЗВЕЩЕНИЕ
о проведении аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Дзержинского филиала Минского областного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже **магазина № 19** (*составные части и принадлежности: блочная пристройка, крыльцо*) **с инв. № 620/С-37424 общей площадью 84,5 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 622250100001005068** (*право аренды по 24.09.2114*) **площадью 0,0407 га по адресу: Минская область, г. Дзержинск, ул. Советская, 4.**

Земельный участок имеет ограничения в использовании: водоохранная зона водных объектов, пл. 0,0407 га, охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000 вольт, пл. 0,0069 га, охранная зона сетей и сооружений газоснабжения, пл. 0,0119 га.

Начальная цена с НДС (20 %) – **41 943,76 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены – **4 194,00 бел. руб.**).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330 000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.
Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 5 (пяти) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона и возмещает продавцу затраты на публикацию извещения о проведении аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **09.09.2022 в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **08.09.2022 до 16.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5 в каб. 320. **Тел.: (8017) 516-80-64, 516-80-65, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11, тел. для осмотра: (801716) 649-33, (8029) 578-35-46.**

Центр Промышленной Оценки
• ОРГАНИЗАЦИЯ АУКЦИОНОВ
• ОЦЕНКА ВСЕХ ВИДОВ ИМУЩЕСТВА

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

Организатор аукциона	ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703
Продавец	ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29
Оператор ЭТП	ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703, оф. 46, www.ipmtorgi.by

Предмет электронных торгов
Изолированные помещения (назначение – торговые помещения), расположенные в Минская обл., Минский р-н, Щомыслицкий с/с, район д. Озерцо, Менковский тракт, 2

Лот №	Наименование	Инв. номер	Общая площадь, кв. м	Начальная цена лота с НДС 20 %, бел. руб.
1	Изолированное помещение № 450	600/D-64265	12,1	**5 880,00**
2	Изолированное помещение № 440	600/D-64279	12,1	**5 880,00**
3	Изолированное помещение № 441	600/D-64280	12,1	**5 880,00**
4	Изолированное помещение № 436	600/D-64291	12,1	**5 880,00**
5	Изолированное помещение № 437	600/D-64302	12,1	**5 880,00**
6	Изолированное помещение № 438	600/D-64303	12,0	**5 880,00**
7	Изолированное помещение № 439	600/D-64304	12,0	**5 880,00**
8	Изолированное помещение № 435	600/D-64306	12,5	**6 120,00**
9	Изолированное помещение № 443	600/D-64309	12,1	**5 880,00**
10	Изолированное помещение № 442	600/D-64310	12,1	**5 880,00**
11	Изолированное помещение № 681	600/D-64373	11,4	**5 520,00**
12	Изолированное помещение № 549	600/D-64448	17,0	**8 280,00**
13	Изолированное помещение № 572	600/D-64493	22,5	**10 920,00**
14	Изолированное помещение № 604	600/D-64641	11,2	**5 400,00**
15	Изолированное помещение № 663	600/D-64659	11,7	**5 640,00**
16	Изолированное помещение № 605	600/D-64683	11,3	**5 520,00**
17	Изолированное помещение № 606	600/D-64690	11,2	**5 400,00**
18	Изолированное помещение № 617	600/D-64768	11,3	**5 520,00**
19	Изолированное помещение № 618	600/D-64771	11,3	**5 520,00**
20	Изолированное помещение № 620	600/D-64774	10,9	**5 280,00**

Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY47 BELB 3012 0028 5000 3022 6000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

Срок заключения договора купли-продажи: 10 рабочих дней после проведения аукциона

Условия оплаты предмета электронных торгов: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее 5 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи

Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов, установлены регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги», размещенным по адресу: www.ipmtorgi.by

Победитель электронных торгов либо единственный участник электронных торгов, согласившийся повысить начальную цену предмета электронных торгов на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить установленное вознаграждение в размере 0,6 % от цены продажи в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения электронных торгов

Передача предмета аукциона победителю торгов (единственному участнику), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 5 (пяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости имущества. Победителю торгов (единственному участнику) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины; с государственной регистрацией автомобиля несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия

Дата и время начала и окончания электронных торгов: в 11.00 08.09.2022 до 12.00 08.09.2022.
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов

Дата и время окончания приема заявок: по 06.09.2022 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» по адресу: www.ipmtorgi.by

Контактные телефоны:
+375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by

«Я ВЕДАЎ, ШТО ЁН НІКОЛІ НЕ ЗАЧЭПІЦЬ МЯНЕ, — ЗВЯРЫ ЎМЕЮЦЬ ПОМНІЦЬ ДАБРЫНЮ»

Якіх істот трымалі ў хаце літаратурныя героі?

Зразумела, і ў пісьменнікаў маюцца хатнія жывёлы — кошкі, сабакі, папугайчыкі, рыбкі... Праўда, на тое і пісьменнікі, каб вылучацца ва ўсім. Чарльз Дыкенс трымаў крумкача па мянушцы Грып, Байран яшчэ студэнтам Кембрыджа завёў мядзведзя і выгульваў яго на ланцугу да агульнага застрашэння і абурэння, Шарль Бадлер прытуліў кажана, якога ўласнаручна карміў малаком і хлебам, а нарвежскі драматург Генрык Ібсен меў за гадаванца... скарпіёна.

Зразумела, хатнія жывёлы нярэдка робяцца героямі твораў сваіх гаспадароў. Не выключэнне і беларускія літаратары. Давайце паглядзім, каго яны сялілі ў дамах сваіх персанажаў.

Мядзведзь

Уладзімір Караткевіч падзяляў густы Байрана ў дачыненні да хатніх гадаванцаў. Прынамсі, у апавяданні «Былі ў мяне мядзведзі» галоўны герой, мастак-аніматаліст, сын лесніка, ажно двух мядзведзяў за жыццё прытуліў. Першага, Бурыка, яшчэ ў дзяцінстве.

«Яго прынеслі мне ўзімку саракавога года. Прынёс паляскоўшчык з Румеля, мужык з чырвонымі шчочкамі, кучаравымі вялізнымі вусамі і саладзейшымі вочкамі колеру турэцкага тытуню. Палясоўшчыкі ўспаролі мядзведзіцу — тады яшчэ паляванне на мядзведзяў не было забаронена,— забілі яе, двух медзведзянят пабралі сабе, а трэцяга занеслі бацьку».

Медзведзянятка было зусім маленькае, яго даводзілася з рук карміць, паіць... А калі Бурык пачаў падрастаць, гаспадары прывучалі яго, як паводзіцца ў лесе, здабываць ежу.

«Марка спецыяльна, на вачах у яго, адкідаў і перакульваў камяні і калоды, браў чарвякоў, што спяшаліся ў зямлю, ды лічынак і харчыў імі Бурыка. Той аж чамкаў. З месяц нічога ў нас не атрымлівалася. І якая ж была радасць, калі ён упершыню паспрабаваў адцягнуць калоду. Невялікую. Ён быў гладзенькі, і сыты, і ўжо досыць моцны.

— Пакрыўдзілі мы яго, — сказаў Марка, — то трэба выправіць, як здолеем. Каб не збыткаваўся з яго лес, як выпусцім».

Мудрыя гаспадары патрапіліся Бурыку... *«Пэўна, не адзін чалавек шчыкаў тады сябе за руку, убачыўшы, як купаюцца ў Водры або разам выходзяць на адхон хлопчык і мядзведзь, якога хлопчык вядзе за вуха».* Нават калі Бурык нашкодзіў, да мёда ў каморы дабраўся, не пакаралі:

«— А чаго яго біць, — спакойна сказаў бацька і нібы растлумачыў: — Мядзведзь. Узялі, то цярпець маем. Мёд — гэта ўжо вышэй за яго і за дысцыпліну».

Бурык выратаваў жыццё героя, калі на таго пабег ашалелы бык... А потым яго выпусцілі ў лес...

«...Маці дазволіла адвесці мядзведзя толькі ў нядзелю, усе тры дні адкормлівала яго, як кабана, і калі мы вялі Бурыка ў машыну — дырэктар, у падзяку за бугая, даў дзеля гэтага старэнькую саўгасаўскую палутарку, — цалавала яго ў морду і плакала».

Вось жыццё другога мядзведзя аказалася гарчэйшым... Ён удзельнічаў у здымках фільма пра тое, як да мастака-аніматаліста трапляе медзведзянятка. Пасля здымкаў Тупа аддалі на станцыю юных натуралістаў... Але там вісусы пачалі яго мучыць, звер узбунтаваўся — і вярнулі яго на студыю. Дзе ён ледзь не здох... Пакуль той жа мастак не пабачыў яго і не забраў сабе.

«...Другі мой мядзведзь пражыў у мяне два з паловаю месяцы, і, слова гонару, гэтыя месяцы былі аднымі з найлепшых месяцаў у маім жыцці. Слаўна нам жылося. Ён пасыцеў, поўсць стала льснянай і чыстай. Любіў качацца ў снезе і купацца. Спаў каля батарэі, але часам клаўся да мяне ў ногі і ўпарта не хацеў злазіць з тахты. Я ведаў, што ён ніколі не зачэпіць мяне, ніколі не азвярэе, што гэтыя сталёвыя простыя кіпці, толькі злёгку сагнутыя на канцы, ніколі не ўдараць: звяры ўмеюць помніць дабрыню. Але што я мог зрабіць? Улетку я заўсёды ад'язджаў на некалькі месяцаў маляваць, і на каго я мог пакінуць яго ў горадзе? А ўзяць і вазіць з сабой?.. Мне заставалася суцяшэнне, што я даў яму пару месяцаў харошага жыцця, якое нічым не было азмрочана».

Гаспадар завёз Тупа ў запаведнік — «жыць на волі і для волі».

У апавяданні два фіналы — чытач, як і галоўны герой, сам выбірае, у які верыць. У адным варыянце Тупа застрэльваюць, у другім ён шчасліва жыве ў лесе.

Цмок

Ну як жа абысціся без цмокаў, беларускіх драконаў! У кнізе Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня, альбо Беларусь у фантастычных апавяданнях» ёсць гісторыя пра дворнага слугу Карпа, які хоча ажаніцца з прыгажуняй Агапкай, а для гэтага, паводле волі пана, трэба зарабіць пэўную колькасць грошай на гаспадарку. А для гэтага звяртаецца да Парамона, найстрашнейшага чараўніка.

«Парамон выняў са скрыні загорнутыя ў паперу нейкія зярняткі і, даючы іх Карпу, так раіць:

— Калі не маеш свайго чорнага пеўня, дык расстарайся дзе-небудзь, накарміш яго гэтым зернем, і ён праз колькі дзён знясе яйка, не большае за галубінае. Гэтае яйка ты павінен насіць цэлы месяц пад леваю пахаю. Праз месяц вылупіцца з яго маленькая яшчарачка, якую будзеш насіць пры сабе і кожны дзень карміць малаком са свае далоні. Расці яна будзе хутка, а па баках у яе вырастуць скураныя крылы. Праз месяц яшчарка ператворыцца ў крылатага цмока. Ён будзе выконваць усе твае загады. Ноччу ў чорным абліччы прынясе табе жыта, пшаніцы і іншага збожжа, а калі прыляціць, палаючы агнём, дык гэта значыць, што будзе мець пры сабе золата і срэбра. Жыві з ім у дружбе, калі хочаш быць багаты, бо калі ўгнявіш, дык ён можа спаліць табе хату і ўсё тваё дабро».

Помнік Цмоку ў Лепелі.

Так, урэшце, і сталася — цмок, якога Карпа выгадаваў і які зрабіў яго багатым, спаліў яго хату, бо пабожная Агапка, стаўшы жонкай Карпы, не захацела цярпець прысутнасць нячыстай сілы...

Кура Шчабятура

Але не заўсёды чалавеку хапае мудрасці выбраць хатняга гадаванца па сваіх сілах. У фантастычнай аповесці Пятра Васючэнкі пра авантуры паноў Кубліцкага ды Заблоцкага хто толькі не з'яўляўся ў доме лянотных шляхетных паноў... Аднойчы галодныя паны сустрэлі Куру Шчабятуру, вялікую пярэстую птушку, якая прапанавала панам знесці для іх яйка.

«— Што нам за наедак з твайго яйка, калі мы з панам Кубліцкім глытаем іх адразу цэлае рэшата, — пагардліва кажа пан Заблоцкі.

— Вось каб з яйка ды вывелася куранятка, — уторкнае свае два шэлегі пан Кубліцкі.

— А што? Можна, каб вывелася. Бо я птушка заморская, яйкі не абы-якія нясу, — кажа Кура Шчабятура.

— А ў кураняці будуць усяго дзве ножкі? — трывожыцца пан Кубліцкі. — А ці можна, пані Кура, каб адразу чатыры нагі?

— Сорак, сорак, — сіпіць пан Заблоцкі. — Падавай нам кураня-сараканожку.

— Можна і гэта, — згаджаецца Кура. Але пану Заблоцкаму ніяк не ўладзіш.

— Каб і сала было на ім у дзюлоню таўшчынёй! А ростам каб была з быка! Во!

— Добра, панове, — кажа Шчабятура. — Толькі я такую гаргару не бяруся наседжваць. Ужо самі, панове, як-небудзь старайцеся».

Знесла Кура Шчабятура на замову паноў яйка са стог вышынёю.

«Хапіла клопату панам, пакуль па чарзе наседжвалі яго сваімі шырокімі азадкамі. Але вось у яйку нешта грукоча, нешта стукоча, як у малатарні, асыпаецца шалупінне — і перад панамі з'яўляецца куранятка. Няможна апісаць, што гэта быў за страхапуд. Гара гарою, наперадзе бычыныя рогі і свінячы лыч, назаду хвост, як у пеўня. Яно рохкае немым голасам, тады лопае скрыдлямі — і паны валяцца на зямлю як падкошаныя. А пачвара з жудасным рохканнем прастае на сарака лапах да лесу, ажно зямля за ёю курыцца.

З тае пары за рэчкай Парэчкай у пракаветнай пушчы завёўся страшэнны звер. Днём ён хаваецца ў нетрах, а ўвечары падкрадаецца да чалавечага жытла, душыць сабак, свіней, кароў. А як у небе поўня, дык рохкае на ўсю ваколіцу, і ад таго рохкання ў людзей валасы шапку падымаюць».

Вожык

Янка Брыль распавядае пра істоту, якую беларусы нярэдка трымалі ў дамах.

«Нашага вожыка тата злавіў у лесе і прынёс у кішэні дахаты. Спачатку вожык ляжаў як клубок. Як паклалі яго ў кутку, пад маім ложкам, так ён і ляжаў. Я наліў яму ў сподачак малака. А вожыку хоць бы што. Тады я лёг побач з ім на падлозе і пачаў назіраць.

На дварэ змяркалася, і пад ложкам рабілася цёмна.

— Дурненькі ты, — сказала мама. — Ты яго толькі не чапай, ён і сам малако тваё знойдзе.

І праўда, толькі я лёг у ложак і ў хаце зрабілася ціха, як у куточку нешта ціхенька заварушылася. Заварушылася і пачало вось гэтак чмыхаць:

— Ту-ту-ту-пых! Ту-ту-ту-пых!

А потым па дошках падлогі затупацелі маленькія мяккія ножкі».

Герой апавядання любіць свайго Тупціка, нават каб развесяліць, зняў аднойчы са сцяны люстэрка і паставіў на падлозе. *«А вожык падышоў да люстэрка, паставіў лычык, паглядзеў і надзьмуўся, каб настрашыць таго, што ў люстэрку. А той, што ў люстэрку, надзьмуўся таксама, і вось яны разам зрабілі:*

— Пых!»

Але гаспадары не захацелі пазбаўляць звярка волі назаўсёды, занеслі Тупціка ў агарод і выпусцілі.

Жораў

Жораў з апавядання Цёткі «Міхаська» — адзін з самых запамінальных і шчымлівых герояў беларускай літаратуры. Ён робіцца адзіным сябрам сіраты Міхаські, якога з маленства цкуюць, збіваюць, мораць голадам... Хлопчык ні ад каго дабра і спачування не бачыў, рос азлобленым... Пакуль не адбіў ад вясковых хлапчукоў параненага жорава. Птушка і сірата сталі ратункам адно аднаго. Разам сядзелі ў падпечку, разам цярпелі голад і злосць Міхаськавай мачыхі... Дзякуючы птушцы, якая шчыра адказвала на ягоную любоў, і Міхаська змяніўся... І стаўленне да яго людзей таксама. І калі бедны хлопчык памёр, жораў праводзіў яго ў апошнюю дарогу.

«...зварухнуўся, азірнуўся па ўсіх кутах і выйшаў за дамавінай. Людзі дзівам задзіміліся і далі дарогу птушцы. Сумна, важна, як сплаканая маці, жораў першы пайшоў за Міхасём...

— В-е-е-чны па-а-кой... — застагнала песня над свежай магілай; жораў задрыжэў, колькі разоў пахіснуўся на нагах і лоп-лоп... узмахнуў шэрымі крыллямі і ўзняўся да палётаў.

Паволі, цяжка птушка падымалася ў воблакі, бо несла з сабою вялікі жаль зоркам ясным, хмаркам белым...

— Кр-р, кр-р!.. — скардзілася гарачаму сонейку, — кр-р, кр-р!.. — расказвала напатканым брацейкам-жоравам...

Цяпер могілкі параслі ўжо дзёрнам, і там зялёна кругом. Як вокам сцяць — густы лес шуміць. На магілцы Міхася крынічка стаіць, і завецца яна Жураўліныя слёзы».

Воўк

Пра племя неўраў, якое жыло ў беларускіх лясах — магчымых нашых продкаў, — антычныя храністы занатавалі, што яго людзі могуць ператварацца ў ваўкоў... Недарэмна ў нас столькі легенд пра ваўкалакаў. І ваўкі хоць і нячасты госць у хатах, але ж з'яўляюцца. Прыкладам, у апавяданні Алеся Пальчэўскага. Гэты беларускі пісьменнік зведаў шмат дачыненняў з дзікай прыродай — у 1930-х быў беспадстаўна арыштаваны, давялося жыць у сібірскіх лясах...

«Аднойчы пайшоў я ў лес з дубальтоўкай за плячыма. Іду, углядаюся па баках і раптам натыкаюся на воўчае логава. Прыгледзеўся і бачу, што маленькае ваўчаня зашылася ў куточак і спалоханымі вочкамі глядзіць мне ў твар. Так і просіцца: «Не бі мяне, чалавеча, я ж маленькі...» Шкада мне яго стала. Драпежнік-то драпежнік, але зла яшчэ ніякага не зрабіў і віны за сабою не мае. Дык за што ж яго біць? Пры мне была паляўнічая сетка, злавіў я гэтае ваўчаня і панёс дахаты».

Паспрабаваў прыручыць ваўка і герой апавядання Віталя Вольскага «Ліпень»:

«Знаёмы кінамеханік з Узды прывёз мне неяк у ліпені ваўчаня. Малому было каля трох месяцаў. Ваўчаня было вельмі забаўнае. Усімі сваімі звычкамі і паводзінамі яно нагадвала сабаку. Калі я прыходзіў дамоў, ваўчаня кідалася мне насустрач, віляла хвосцікам, круцілася ля маіх ног, лажылася на спіну і, жартуючы, злёгку пакусвала мне рукі. Ноччу яно залазіла ў ложак і спала ў мяне ў нагах.

Я карміў яго поліўкай з кавалкамі хлеба, варанай гароднінай, касцямі і ўсім, што заставалася пасля абеду. Толькі сырога мяса не даваў яму ніколі».

Ваўчаня расло, рос і яго апетыт, а малады воўк можа з'есці ў тры разы больш, чым звычайны дваровы сабака такога ж росту. І гаспадар аддаў свайго выхаванца ў звярынец.

Вуж

Мала хто любіць змей... Але на Беларусі асаблівыя адносіны да вужоў. Пісьменнік Анатоль Зэкаў піша:

«У сівую даўніну нашы прашчуры сябравалі з вужамі і не крыўдзілі іх. Самі давалі вужам прытулак, кармілі іх хлебам і свежым малаком. Нікога не кусаў вуж, а поўзаў сабе па хаце, як сапраўдны гаспадар. Прысядуць людзі палуднаваць — і ён тут як тут, цягнецца галавой да ежы. Здаралася, хтосьці з дзяцей не вытрымліваў і біў вужаку лыжкаю па галаве. Той пакрыўджана сыкаў, адпаўзаў куды-небудзь у бок ад стала на хвіліну, а потым з іншага боку зноў сунуўся да міскі. Даўней людзі верылі ў тое, што калі з імі побач жыве вуж, то будзе шчасце і дастатак у хаце. А калі вуж памераў, то гаспадары вельмі смуткавалі і рабілі з вужовага тлушчу свечку на ліхі дзень».

Пацвярджае тое і Іван Мележ у «Людзях на балоце»:

«Вужы жылі ледзь не на кожным селішчы пад падлогамі, у хлявах, у прыгрэбніках... вужоў у Куранях не баяліся.

Матка казала Васілю, што ў суседа Дамеціка вуж, які ўжыўся ў хляве, осе карову, але Дамецікавы не гналі яго. Васіль не здзіўляўся гэтаму: як і ўсе ў Куранях, лічыў ён вужа добрай істотай, крыўдзіць якую — грэх...»

Напэўна, і ў вашай хаце ёсць які-небудзь гадаванец, які натхняе і падымае настрой... Галоўнае, ставіцца з любоўю і павагай да кожнага Божага стварэння... Як падказвае і народная мудрасць.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.

ЗАМЕСТ МОРА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Калі возера, то Нарач?

Людзі разумныя і дальнабачныя яшчэ зімой або ранняй вясной набылі пуцёўкі ў санаторыі або забранiравалі аграэкасядзібы на летні сезон. Калі вы пра свой адпачынак не паклапаціліся загадзя або лічыце, што вышэйпералічаныя варыянты неапраўдана дарагія — давядзецца стаць самому сабе тураператарам. Увогуле, у нашых шыротах усё залежыць ад надвор'я, і яно пакуль не падводзіць. Сонечных дзён у тым жа ліпені, напрыклад, было больш, чым пахмурных, — такое здараецца не кожнае беларускае лета, так што ловім момант. А купацца і загараць у Сінявокай ёсць дзе.

Пачнём з самых відавочных варыянтаў — Нарач, Браславы або тая ж Свіцязь. З плюсоў агульнапрынятых месцаў адпачынку — добраўпарадкаваныя пляжы, наяўнасць на іх ратавальнікаў (што немалаважна, калі вы з дзецьмі), бяспечнае дно без камянёў, карчакоў і бітага шкла, буйкі, якія абазначаюць пачатак сапраўднай глыбіні і г. д. З мінусаў — вялікая колькасць адпачывальнікаў, якія гэтак жа, як і вы, гэтым летам выбралі адпачынак паблізу ад дома. Але гэты мінус далёка не заўсёды праяўляе сябе. Напрыклад, чым далей вы ад вялікіх гарадоў, тым менш людных будуць пляжы. Асабліва калі выбіраць будняя дні, бо вы ў адпачынку і можаце дазволіць сабе адправіцца на пляж нават у панядзелак з раніцы. А вось наяўнасць вялікай колькасці санаторыяў па берагах папулярных азёр — якраз нядрэнна. Пляжы санаторыяў добраўпарадкаваныя, і часам можна ўладкавацца на іх або непасрэдна каля іх. Так вы атрымліваеце зручны падыход да вады, а часам і бонусы ў выглядзе водных горак для дзяцей або пракату лодак, катамаранаў, сёрф-дошак і г. д. Таксама на добраўпарадкаваных пляжах звычайна ёсць дзе купіць папіць ды паесці.

Калі хочацца танней

Хоць пляжныя кафэ лепш абыходзіць увагай, калі ваша задача — сэканоміць. У краме па дарозе да возера вы купіце тую ж ваду танней, а хатнія бутэрброды замест бургераў і хот-догаў будуць да таго ж яшчэ і больш карысныя для страўніка. Той жа прынцып (далей — танней) датычыцца і пражывання, калі вы прыехалі на некалькі дзён або на тыдзень. Санаторый сярэдняй рукі на маляўнічым беразе ўпадабанага адпачывальнікамі возера будзе каштаваць ад 50 рублёў у дзень на чалавека (але думаць аб гэтым варыянце трэба было мінімум месяцы тры таму: ужо ў пачатку лета ў здраўніцах практычна ўсё было забраніравана). Аграсядзібы — прыкладна ў тых жа цэнавых межах (і браніраваць іх таксама трэба было загадзя: цалкам верагодна, усё будзе распісана на тыдні наперад). Застаецца гасцініца або кватэра на суткі ў найбліжэйшых населеных пунктах (яе пошукамі лепш заняцца яшчэ да выезду з дому). Калі казаць аб гасцініцы, не варта шукаць яе ў больш-менш буйных гарадах, лепш абраць невялікія і зусім не турыстычныя населеныя пункты ў ваколіцах «вашага» возера: абыдзецца на парадак танней за прыкладна аднолькавы нумар. Праўда, лепш папярэдне патэлефанаваць у абраны гатэль і ўдакладніць, ці паселяць вас. У маленькіх мястэчках і гасцініцы маленькія — прыехала пара-тройка камандзіровачных, і ўсё, месцаў няма. Калі вас цікавіць бюджэтны варыянт, выбірайце не прыватную, а максімальна «савецкую» дзяржаўную гасцініцу. Там усё будзе па-спартанску, проста дах над галавой, затое вельмі адэкватна па цане.

Калі вы вырашылі пажыць каля возера некалькі дзён, узнікае пытанне харчавання, асабліва калі вы з дзецьмі або «сухаматка» вас у прынцыпе не задавальняе. У больш-менш буйных гарадах пры гасцініцах звычайна ёсць сталовая і/або рэстаран. У любым выпадку які-небудзь пункт грамадскага харчавання ў нашы дні з вялікай доляй верагоднасці можна знайсці паблізу ад гасцініцы нават у зусім невялікіх населеных пунктах. Мінчан і жыхароў абласных цэнтраў цэны (а часта і памер порцыі) там прыемна здзівяць. Выбар страў, праўда, невялікі, але калі вы загадзя да гэтага гатовыя, абавязкова знойдзеце што-небудзь прымальнае для сябе і дзяцей. Дарэчы, яшчэ ў маленькіх мястэчках можна пашукаць сталовыя прадпрыемстваў — часам туды пускаюць і старонніх, і гэта можа аказацца самым бюджэтным варыянтам.

Яшчэ адзін від пражывання для эканомных — кемпінгі. За двухмесную палатку вы заплаціце ў сярэднім 10—13 рублёў за суткі, за чатырохмесную — 20—25. У кошт звычайна ўваходзіць размяшчэнне палаткі, карыстанне кантэйнернай пляцоўкай (плюс смеццевыя пакеты), стаянка аўтатранспарту, вада, санвузел. Палаткі выдаюць напракат, як і спальныя мяшкі (каля 5 рублёў за суткі), турыстычныя дыванкі (звычайна 2 руб/суткі), шампуры (4 руб/суткі), мангалы і г. д. Палатку прыйдзецца ставіць самастойна — праўда, калі зусім ужо не атрымліваецца, на дапамогу прыйдуць супрацоўнікі кемпінга або суседзі. А ежу можна гатаваць на вогнішчы: адчуй сябе Рабінзонам. Праўда, і тут ёсць звычайны для гэтага лета нюанс — усе месцы могуць быць забраніраваны загадзя. Ці знойдзецца куток для вас, лепш зноў жа ўдакладніць перад выездам.

«Мы засталіся дома, хоць у папярэднія гады адпачынак праводзілі ў Турцыі, Егіпце, Балгарыі або ў іншых курортных краінах, якія былі адносна недарагія. Рызыкнулі выбрацца да мора, нават калі была пандэмія ковіду. У гэтым годзе спалохаў доўгі пералёт і ўзрослы кошт тураў, — расказвае 34-гадовая Сафія: — Дзеці (у мяне іх двое, старэйшы перайшоў у шосты клас, малодшы — у другі), вядома, разгубіліся, што мы не едзем да мора. Але паколькі мы на машыне, вырашылі знайсці «альтэрнатыву мору» ў Беларусі. Свіцязь я выбрала з-за легенды — падумала, можна будзе расказаць яе сынам, каб зацікавіць. А таксама з прагматычных меркаванняў: абяцалі добраўладкаваныя пляжы, пясчанае дно і ваду на некалькі градусаў цяплейшую, чым у астатніх вадаёмах. Вада і праўда аказалася вельмі чыстай і цёплай. Мы размясціліся побач з пляжам санаторыя: паблізу ад яго бераг таксама вельмі добры. У вадзе стаяла вялікая надзіманая горка, так што сыны былі задаволеныя. Вядома, горка прызначалася для дзяцей адпачывальнікаў, але і «чужых» не праганялі. Жыць мы вырашылі ў Карэлічах з меркаванняў эканоміі. І не памыліліся: суткі пражывання на траіх абышліся нам у суму каля 40 рублёў, а харчаванне ў кафэ па суседстве — усяго ў 12—15 рублёў на ўсіх за паўнавартасны абед. Калі казаць пра пакой, то, зразумела, у такіх гатэлях плаціш, па сутнасці, толькі за спальныя месцы. Але ж мы і прыходзілі ў гасцініцу толькі пераначаваць. Увечары, вядома, на такім адпачынку рабіць зусім няма чаго і пайсці няма куды. Але гэта — падстава правесці вечар з дзецьмі, бо дома на гэта ніколі няма часу. Пагуляць у настольную гульню або разам паглядзець сямейны фільм, прыхапіўшы з сабой з дома ноўтбук. У цэлым адпачынкам я засталася задаволеная. Пашанцавала, што не падвяло надвор'е. За гэтыя пяць дзён дзеці загарэлі так, што знаёмыя пыталіся, куды мы ездзілі адпачываць. Хапіла часу і на агляд славутасцяў і цікавых месцаў у ваколіцах Свіцязі. Наведалі ўнікальную драўляную царкву 1685 года, храм Святой Варвары, велічныя старадаўнія руіны ў вёсцы Беразавец, пабывалі на радзіме Адама Міцкевіча ў Завоссі, а на старажытным капішчы зусім нечакана для сябе трапілі нават на паганскае свята, якое, аказваецца, тут ладзіла моладзь з гістарычнай рэканструкцыі. Аказалася, што разрэкламаваныя славутасці іншых краін мы ведаем значна лепш, чым свае ўласныя. Так што пачалі адкрываць сваю краіну».

Невідавочныя варыянты

Зрэшты, самыя відавочныя варыянты — Нарач, Браславы, Свіцязь або, напрыклад, Мінскае мора, не заўсёды аказваюцца найлепшымі. Часам там занадта шмат людзей, занадта цесна, шумна і дорага. Але на тое Беларусь і Сінявокая, што месцаў для купання тут дастаткова. Можна іх пашукаць бліжэй або далей — Гугл у дапамогу. Дапусцім, Васькаўскае возера замест Нарачы, Вілейскае вадасховішча замест Мінскага мора або Удранка замест Драздоў. А можа, варта наведаць памятныя месцы дзяцінства? Калі вы там адпачывалі калісьці з бацькамі, чаму б не звазіць туды і ўласных дзяцей? Збіраючыся на такое возера, варта ўдакладніць, ці ёсць там зараз месцы для купання і наколькі яны добраўпарадкаваныя. Можа аказацца, што са «зручнасцяў» на берагах не самых папулярных вадаёмаў — толькі распранальні, і калі для вас прынцыповы камфорт, гэта не ваш варыянт. Што асабліва датычыцца настальгічных «вадаёмаў з дзяцінства», МНС нагадвае: вельмі непажадана купацца на дзікіх неабследаваных пляжах, асабліва калі вы з дзецьмі.

Для многіх адпачынак — гэта яшчэ і фатаграфіі на фоне прыгожых пейзажаў або ў цікавых лакацыях. З гэтым якраз усё ў парадку — ёсць магчымасць увасобіць мноства ідэй для фотаздымкі і выкласці ў сацсеткі фота, пра якія вас будуць пытацца: «А гэта дакладна ў Беларусі?». Ужо чаго-чаго, а жывапісных руін, таямнічых старадаўніх храмаў, помнікаў архітэктуры і чароўных прыродных куткоў у Беларусі хапае, і да многіх з іх дабрацца на машыне прасцей за ўсё якраз летам, калі суха. Сярод «інстаграмных» месцаў — «перакулены дом» у Дукорах, дракар у Суле, «тыбецкі» падвясны мост у Ручыцы. Працягваючы водную тэматыку, напрыклад, вадаспад на рацэ Вятцы, найбуйнейшы сярод некалькіх беларускіх вадаспадаў. Там, дарэчы, цяпер ёсць нават сякая-такая інфраструктура: лаўкі, альтанкі і спускі да вады.

Робім высновы. Выдаткаваць грошы ўсё роўна прыйдзецца — на дарогу, харчаванне і, пры жаданні, некалькі дзён пражывання паблізу абранага вадаёма. Плюс давядзецца ўключыць фантазію. Але пры наяўнасці гэтых складнікаў можна атрымаць дастаткова яркія «адпускныя» ўражанні. Галоўнае — не сядзець дома, не закопвацца ў паўсядзённыя справы, пастарацца вырвацца з руціны, бо менавіта ў гэтым — галоўны эфект падарожжа: вы трапляеце ў іншае асяроддзе. Можна паспрабаваць дамагчыся гэтага і не ад'язджаючы далёка ад дома.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

З нагоды

Першы ў Беларусі каравай-фэст «Бацькава булка» адбудзецца ў Гродзенскай вобласці

У Свіслачы пройдзе першы ў Беларусі каравай-фэст «Бацькава булка». Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе Гродзенскага аблвыканкама.

«Каравай-фэст «Бацькава булка» — гэта новы сацыяльна-культурны праект. Ён накіраваны на развіццё сучаснай беларускай і папулярызацыю традыцыйнай культуры. Каравай-фэст адбудзецца 20 жніўня. Асноўнай пляцоўкай свята стане гарадская плошча Свіслачы», — расказалі ў прэс-службе.

Гасцей фестывалю чакае насычаная і цікавая тэматычная праграма. У рамках свята пройдзе конкурс вырабаў з цеста сярод прафесійных пекараў, выстава хлебных шэдэўраў «Бацькаўшчына», якія прысвечаны гістарычным аб'ектам Беларусі. Любы ахвотны зможа прыняць удзел у эстафеце «Бацькава міля», а таксама ў экскурсійным майстар-класе.

«Гасцей першага ў Беларусі каравай-фэсту чакае і музычная праграма. Акрама калектываў з Гродзенскай і Брэсцкай абласцей, выступіць гурт «Дразды». У планах на цырымоніі адкрыцця — правядзенне акцыі «Беларусь — хлебная краіна»: з маленькіх булачак будзе сабрана карта Беларусі», — удакладнілі ў прэс-службе аблвыканкама.

Карысна ведаць

У ЛЕС СЯМІ РАЁНАЎ КРАІНЫ — «НІ НАГОЙ»

У сувязі з рэзкім павелічэннем тэмпературы паветра на гэтым тыдні Міністэрства лясной гаспадаркі абмяжоўвае наведванне лясных масіваў для грамадзян. Паводле інфармацыі ведамства, у Беларусі масавыя забароны і абмежаванні ўведзены ў 62 раёнах краіны.

Паводле аператыўнай інфармацыі, лясы Віцебскай вобласці па-ранейшаму дазволена наведваць. Абмежаванні і забароны не закранулі і тэрыторыю Магілёўскай вобласці. Усе астатнія рэгіёны краіны трапілі ў разрад праблемных. Абмежаванні ўведзены ў 19 раёнах Мінскай вобласці, 17 — Гродзенскай, 16 — Гомельскай і 10 — Брэсцкай.

Аператыўна адсачыць сітуацыю можна на сайце Мінлясгаса з дапамогай інтэрактыўнай карты. Згодна з гэтай картай, жоўтым колерам вылучаны раёны краіны, дзе наведванне лясоў абмежавана, чырвоным — дзе забаронена. Такім чынам, на дату 5 жніўня наведванне лясоў забаронена ў сямі раёнах краіны. Гэта Нараўлянскі, Ельскі, Калінкавіцкі, Мазырскі, Брагінскі, Лоеўскі і Рэчыцкі раёны.

Такое папярэдняе інфармаванне дапаможа пазбегнуць рызык для ляснога фонду і штрафных санкцый для парушальнікаў, у тым ліку тых, хто наведвае лясы, але не ведае пра забарону.

Сяргей КУРКАЧ.

КАЛІ ХОЧАЦЦА «ВОСТРАНЬКАГА»

Удакладнілі, дзе варта купляць спецыі і як з імі не памыліцца

У Якуба Коласа ў «Новай зямлі», у частцы «Раніца ў нядзельку», згадваюцца прыправы, якія ўжывала простая сялянская сям'я: «цыбуля, перчык, ліст бабкоў...» У сучасных гаспадынь гэты спіс можа быць значна даўжэйшы (хоць нямала і тых, каму па-ранейшаму хапае цыбулі, чорнага перцу і лаўровага ліста). Але калі звыклыя стравы надакучылі і ўсё, што вы гатуеце, здаецца вам прэсным... тады ідзём па спецыі!

Але як яны павінны выглядаць, пахнуць, якімі быць па кансістэнцыі — усё гэта многія ўяўляюць вельмі прыблізна. Спецыі — тэра інкогніта для большасці гаспадынь, якія выраслі ў нашай кулінарнай культуры.

Хоць Амад, які ўжо дзевяць гадоў гандлюе на Камароўцы прыправамі, з гэтым не згодны. Кажа, ёсць у яго беларускія пакупніцы, якія выдатна разбіраюцца ў спецыях.

— І наогул, за дзевяць гадоў пакупнікоў у мяне стала значна болей, — дзеліцца ён.

Ва Узбекістане, распавядае Наргіз (яна таксама прадае спецыі на адным з мінскіх рынкаў), разбірацца ў спецыях і ўмець смачна гатаваць — гэта адно і тое ж, а гатаваць ежу вучыцца кожная дзяўчынка з трох гадоў.

У краму ці на рынак?

Спрадвеку людзі выкарыстоўвалі араматычныя расліны не толькі для таго, каб надаць новы смак і водар знаёмым стравам і разнастаіць рацыён, але і для падтрымання здароўя і барацьбы з хваробамі. Напрыклад, здольнасцю супрацьстаяць разбуральнаму ўздзеянню свабодных радыкалаў прыправы пераўзыходзяць ягады, прызнаны антыаксідант. Напрыклад, у чайнай лыжцы высушанага здробненага арэгана больш вітамінаў Е, С і А, калію і магнію, чым у такім жа аб'ёме суніц або гранатавых зерняў. Вострыя прыправы спрыяльна ўплываюць на страўнікава-кішачны тракт, валодаюць болесуцішальным эфектам, могуць узбадзёрыць або вылечыць ад бяссонніцы, выводзяць таксіны і зніжаюць павышаную тэмпературу. Яны дапамагаюць арганізму засвойваць тлустую ежу. У большасці сваёй араматычныя расліны з'яўляюцца адначасова і лекавымі. Але ўсе гэтыя якасці раскрываюцца, толькі калі прыправа свежая.

А па свежыя спецыі прынята ісці на рынак. Прылаўкі з прыправамі і запраўкамі аглушаюць пахамі і фарбамі — так і цягне спыніцца, паглядзець і панюхаць. Размяшчаюцца спецыі на крытым рынку, бо пад адкрытым небам пры ўздзеянні сонечных прамянёў яны хутка страчваюць водар.

— Купіць якасныя спецыі ў Беларусі часам няпроста, — кажа гаспадыня грузінскага кафэ Ніно. — Часта яны выветраныя — занадта доўга «дабіраліся».

Ніно распавядае, што выбар спецый — справа сур'ёзная і складаная. Бо яны лёгка ўбіраюць вільгаць і іншыя пахі, губляюць карысныя і смакавыя ўласцівасці ад сутыкнення з паветрам.

Спецыі «прыязджаюць» у Беларусь з розных краін: Індыя, Кітай, Турцыя, В'етнам, Егіпет і ў асноўным — Узбекістан і Грузія. У тым ліку і традыцыйныя для нашых шырот кроп, пятрушка, часнок, каляндра.

— Сушаны часнок — кітайскай вытворчасці, базілік і чабор — Узбекістан, пятрушка і кроп таксама ўзбекскія, — кажа Амад. — Часнок молаты, перац чорны, куркума і хмелі-сунелі — самыя хадавыя прыправы ў Беларусі, — дадае ён. — У дзень з аднаго прылаўка іх прадаецца прыкладна па 500 г.

У старажытнасці спецыі былі даражэйшыя за золата. І ў нашы дні ёсць сярод іх элітныя. Напрыклад, дзікі жэньшэнь з рэгіёна Кітая Чан Пак лічыцца неверагодна каштоўным, і яго цана даходзіць да некалькіх тысяч долараў за 100 г (штогод яго збіраюць усяго 4 кг). Зрэшты, каб ацаніць іх, трэба быць знаўцам. А наогул, любыя спецыі заўсёды былі і застаюцца нятаннымі — кошт змяняецца штогод у залежнасці ад ураджаю і ў цэлым на асноўныя віды складае 1-3 тысячы долараў ЗША за тону. Але паколькі звычайны спажывец купляе спецыі не тонамі, а дробкамі, жменямі і грамамі, то дарагоўля не адчуваецца. На Камароўцы за 25 г сванскай солі або хмеляў-сунеляў з вас папросяць два рублі. Столькі ж будуць каштаваць традыцыйныя ўзбекскія сумесі для салатаў, мяса, рыбы. У тую ж цану — большасць аднакампанентных прыпраў: напрыклад, каенскі молаты перац, куркума, молатая гарчыца, фенхель. 25 г — самы распаўсюджаны аб'ём пры продажы спецый. І не трэба думаць, што гэта мала: на тыдзень хопіць.

«Аўтарскія» сумесі для курыцы, розных відаў мяса, катлет, рыбы, плову (іх прадавец складае непасрэдна пры пакупніку) звычайна прадаюць па 30 г, у сярэднім па тры рублі 50 капеек. Цэлыя спецыі каштуюць па-рознаму і часам прадаюцца паштучна. Напрыклад, мускатны арэх (ён дабіраецца да камароўскіх прылаўкаў з Індыі) — адзін рубель за адзін арэшак. Дарагімі лічацца шафран, кардамон, натуральная ваніль (кошт на іх на Камароўцы — у сярэднім 2-2,5 рубля за 5 г).

Як не купіць «нешта не тое»

Нават у сябе на радзіме, не кажучы ўжо пра краіны, дзе многія стагоддзі ведалі толькі цыбулю і кроп, спецыі — выдатная глеба для фальсіфікацый.

Напрыклад, молатыя спецыі робяць крыху больш вільготнымі — тады вага павышаецца (а смак і пах становяцца горшымі). Бывае, у тую ці іншую прыправу дадаюць нейкія інгрэдыенты. Напрыклад, у чырвоны молаты перац можа быць дададзеная цагляная крошка, у гарчыцу — попел, таксама ў спецыі могуць дадавацца мука, крухмал, молаты мел. Здараецца, адну спецыю могуць выдаваць за іншую, больш дарагую. У нашых шыротах гэта не складана — наўрад ці многія здольныя на вока адрозніць, скажам, касію ад карыцы або дакладна ведаюць, як выглядае струк ванілі.

— Нават на ўсходнім базары можна купіць несапраўдныя спецыі, — кажа Наргіз. Яна распавядае, як ёй спрабавалі прадаць такія на рынку ў Тунісе.

— Не памыліцца са спецыямі складана, — кажа і Амад. — Нават нас часам падманваюць, калі мы закупляем тавар. А ў мяне вялікі вопыт — я яшчэ да прыезду ў Беларусь гандляваў спецыямі ва Узбекістане.

Такім чынам, калі вы не разбіраецеся ў пытанні прафесійна, застаецца спадзявацца толькі на прадаўца.

Ёсць розныя спосабы выяўлення фальсіфікацый (напрыклад, дома апусціць дробку спецый у ваду. Большасць дабавак выпадзе ў асадак). Але, вядома, найбольш эфектыўны — лабараторны аналіз. Гэта, дарэчы, аргумент на карысць набыцця прыпраў і заправак у крамах або на буйных рынках, дзе адміністрацыя сочыць за рэпутацыяй і за якасцю тавару.

Дарэчы, спецыі, затаўкі і прыправы — не адно і тое ж. Спецыі — гэта дабаўкі, якія надаюць страве пэўны смак (да іх прафесійныя кухары адносяць, напрыклад, соль, цукар і воцат). Затаўкамі (або запраўкамі) называюць цэлыя або молатыя высушаныя рэзкія расліны (гваздзіку, базілік, лаўровы ліст, кмен). А прыправы — гэта сумесь некалькіх кампанентаў.

Дык вось, купляць на рынку Наргіз раіць менавіта затаўкі і набываць іх цэлымі, калі прадаўца вы бачыце ўпершыню і не ведаеце, ці можна яму давяраць. Цэлыя складана фальсіфікаваць.

— Да таго ж перцы гарошкам, цэлая гваздзіка або карыца лепш захоўваюць пах і смак, калі здрабніць іх дома ў кавамолцы, — тлумачыць яна. — А потым змяшаць іх у прыправы можна таксама самой. А можна пакласці ў стравы і ў цэлым выглядзе.

Але пакупнікі аддаюць перавагу менавіта сумесям.

— Сумесі купляюць больш ахвотна, — тлумачыць Амад. — Часцей за ўсё пакупнікі выбіраюць прыправы для мяса і для плову, іх у дзень звычайна прадаецца адналькавая колькасць.

— Самая папулярная запраўка ў нашых гаспадынь — хмелі-сунелі. У апошнія гады нашы жанчыны рассмакавалі і сванскую соль, — распавядае прадавец спецый Крысціна. — А наогул, попыт змяняецца. Калі раней у першую чаргу раскупляліся чырвоны і чорны молатыя і цэлыя перцы, лаўровы ліст, кмен, кроп і пятрушка, то сёння ўсё часцей пытаюцца пра маяран, імбір, арэгана, кардамон, мускатны арэх.

Крысціна кажа, што попыт на спецыі залежыць ад сезона. Напрыклад, з красавіка да пачатку кастрычніка добра ідуць сумесі для шашлыка, з чэрвеня да канца верасня — для засолкі і закатак. А з апошніх дзён лістапада пачынаюцца ўжо навагоднія продажы. У гэты перыяд пакупнікі часам пытаюцца нават пра рэдкія экзатычныя спецыі — калі, напрыклад, вырашылі прыгатаваць на навагодні стол нешта незвычайнае.

— А наогул, бліжэй за ўсё нам па ментальнасці, напэўна, традыцыйныя грузінскія спецыі, — лічыць Крысціна. — Але гэта толькі маё меркаванне. Сванская соль сёння прадаецца гэтак жа добра, як хмелі-сунелі. Хоць яшчэ пару гадоў таму яе амаль ніхто ў нас не ведаў, даводзілася тлумачыць, рэкламаваць.

Сванская соль — аснова грузінскай кухні. Заправа, якая ўключае ў сябе набор рэзкіх траў (насенне кінзы, насенне фенхелю, пажытнік блакітны, насенне кмену дзікага, перац чырвоны пякучы і імерыцінскі шафран), якія змешваюцца ў строгіх прапорцыях і перамолваюцца разам з часнаком і соллю. Разам спецыі даюць водар у шмат разоў багацейшы, чым паасобку. Ужываць сванскую соль трэба як звычайную соль.

— Колькі соліце, столькі яе і пакладзіце, больш не трэба, — тлумачыць суразмоўца.

На Камароўцы ў асартыменце два варыянты сванскай солі — з куркумой і з папрыкай. З куркумой — на аматара: калі вы спрабуеце гэтую заправу першы раз, лепш выбраць з папрыкай.

— З папрыкай сванскую соль бяруць часцей, — кажа і Амад. — З яе ужываннем няма ніякіх тонкасцяў: можна проста пасыпаць вараную бульбу, памідор ці агурок — і ўжо смачна!

А наогул, кажа Крысціна, сумесі, у складзе якіх ёсць соль, досыць «капрызныя». Іх купляць лепш толькі ў праверaных прадаўцоў.

— Вельмі верагодна, што ў такіх сумесях вы купляеце ў першую чаргу соль, а спецыі ў яе дадалі толькі для колеру і прыгажосці. Чым больш солі ў заправе, тым выгадней прадаўцу — бо соль танней за самі спецыі. Таму так важна, каб сумесі з соллю гатаваліся добрасумленна.

«Спрадвеку людзі выкарыстоўвалі араматычныя расліны не толькі для таго, каб надаць новы смак і водар знаёмым стравам і разнастаіць рацыён, але і для падтрымання здароўя і барацьбы з хваробамі».

З чым гэта ядуць?

Вернемся да пытання, **як выбіраць прыправы на рынку.**

Якасныя спецыі абавязкова сухія, распавялі прадаўцы. Яны павінны лёгка рассыпацца пры дакрананні. І камячкоў у іх быць не павінна (калі ёсць — гэта кажа аб несумленным захоўванні і аб наяўнасці вільгаці). Ёсць, праўда, сумесі ў выглядзе пасты — да іх гэтае правіла, зразумела, не адносіцца.

Пах той ці іншай заправы павінен быць моцны і ўстойлівы.

— Купляць спецыі трэба як духі — расцерці некалькі крупінак у пальцах і адысці ад прылаўка, дзе занадта шмат пахаў. Панюхаць. Водар падабаецца? Можаце купляць, — раіць Крысціна.

Тую ці іншую спецыю або сумесь рэкамендуецца таксама паспрабаваць на кончыку языка. Смак павінен быць прыемны і інтэнсіўны, а пасля (у большасці) заставацца гарчынка.

Вядома, лепш за ўсё давяраць дакументам, якія сведчаць аб якасці і паходжанні тавару. Але ў рынкавай мітусні наўрад ці большасць пакупнікоў, акрамя самых скрупулёзных, будзе пра іх пытацца. Калі вы належыце да гэтай апошняй катэгорыі, то ведайце: не варта набываць спецыі, выраблены больш за паўгода таму, яны якраз з вялікай доляй верагоднасці і будуць «выветранымі». І яшчэ: калі ёсць выбар паміж «таннейшай» (калі, вядома, гэта не плата за прыгожую ўпакоўку): як і стагоддзі таму, якасныя спецыі не могуць быць таннымі.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ, фота аўтара.

Як правільна выкарыстоўваць прыправы?

• *Размарын* ідэальны для мясных страў — да смажаніны са свініны, бараніны, трусяціны. У грэчаскай кухні сухімі лісцікамі размарыну запраўляюць мяса хатняй птушкі. У французскай кухні з дапамогай размарыну надаюць смакавы акцэнт мясным і курыным супам.

— Пры ўжыванні размарыну не варта выкарыстоўваць у якасці прыправы лаўровы ліст і наадварот. Яны не спалучаюцца, — кажа Крысціна.

• *Маяран* падыходзіць да соусаў і мясных страў, а таксама для хатняй тушонкі. Надасць непаўторны смак закаткам (агуркі, баклажаны, перац, кабачкі).

— Лепш за ўсё маяран спалучаецца з арэгана і чаборам — гэтыя травы дапаўняюць адна адну, не перашкаджаючы смаку кожнай.

• *Каляндру* часцей за ўсё ўжываюць пры засолцы гародніны і кансерваванні мяса, а таксама пры выпечцы хатняга хлеба. Таксама гэта выдатны араматызатар для алкагольных напояў, у прыватнасці лікёраў.

• *Карыцу* ў молатым выглядзе варта дадаваць у цеста на этапе замешвання. У выглядзе кавалачкаў — у вадкія гарачыя стравы хвілін за пяць да гатоўнасці.

• *Гваздзіка* пры працяглым награванні губляе частку свайго водару, а яе пякучасць, наадварот, узмацняецца. Таму дадаваць яе трэба незадоўга да гатоўнасці стравы.

• *Папрыка* не падыходзіць для смажаных страў — яна лёгка падгарае і надае стравам горыч. Не спалучаецца папрыка з рэпчатай цыбуляй, а таксама з кінзой.

• *Чорны молаты перац* не дадаюць у стравы, якія трэба доўга гатаваць, — ён страціць смак і водар, застанецца толькі горыч. У стравы, якія гатуюцца даўжэй за некалькі хвілін, перац дадаюць толькі гарошкам.

Отчет за январь–июнь 2022 года ООО «Санта Ритейл» Бухгалтерский баланс на 30 июня 2022 года

УНП 291313486

тыс. руб.

Активы	Код строки	На 30.06.2022	На 31.12.2021
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	338 931	351 496
Нематериальные активы	120	3 991	3 603
Вложения в долгосрочные активы	140	10 956	7 767
Долгосрочные финансовые вложения	150	155	1 655
Отложенные налоговые активы	160	0	15
Прочие долгосрочные активы	180	716	537
ИТОГО по разделу I	**190**	**354 749**	**365 073**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	92 718	90 350
в том числе: материалы	211	10 507	8 930
готовая продукция и товары	214	82 211	81 420
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	0	0
Расходы будущих периодов	230	6 888	6 542
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	232	560
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	13 147	44 783
Краткосрочные финансовые вложения	260	0	0
Денежные средства и их эквиваленты	270	18 139	14 211
Прочие краткосрочные активы	280	401	8
ИТОГО по разделу II	**290**	**131 525**	**156 454**
БАЛАНС	**300**	**486 274**	**521 527**
Собственный капитал и обязательства	Код строки	на 31.03.2022	на 31.12.2020
1	2	3	4
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	164 655	164 655
Резервный капитал	440	15	15
Добавочный капитал	450	31 454	31 951
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	-49 367	-49 739
Чистая прибыль (убыток) отчетного периода	470	23 905	0
ИТОГО по разделу III	**490**	**170 662**	**146 882**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	165 350	235 545
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520		61
Отложенные налоговые обязательства	530	1 428	1 643
Доходы будущих периодов	540	0	0
ИТОГО по разделу IV	**590**	**166 778**	**237 249**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	0	0
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	46	37
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	148 788	137 359
в том числе: поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	131 837	126 394
по авансам полученным	632	336	764
по налогам и сборам	633	9 104	1 840
по социальному страхованию и обеспечению	634	1 824	2 465
по оплате труда	635	5 334	5 362
по лизинговым платежам	636	79	111
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	0	0
прочим кредиторам	638	274	423
Доходы будущих периодов	650	0	0
ИТОГО по разделу V	**690**	**148 834**	**137 396**
БАЛАНС	**700**	**486 274**	**521 527**

Отчет о прибылях и убытках за январь–июнь 2022 года

тыс. руб.

Наименование показателей	Код строки	За январь–июнь 2022	За январь–июнь 2021
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	653 379	524 188
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	-492 481	-401 313
Валовая прибыль (010-020)	030	160 898	122 875
Управленческие расходы	040	-19 087	-14 349
Расходы на реализацию	050	-138 640	-117 034
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	060	3 171	-8 508
Прочие доходы по текущей деятельности	070	38 580	18 348
Прочие расходы по текущей деятельности	080	-7 180	-4 571
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (±060+070-080)	090	34 571	5 269
Доходы по инвестиционной деятельности	100	179	2 008
в том числе: доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	61	1 878
проценты к получению	103	118	130
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104		
Расходы по инвестиционной деятельности	110	-1 788	-1 829
в том числе: расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	-1 788	-1 829
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112		
Доходы по финансовой деятельности	120	1 535	677
в том числе: курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	1 535	677
Расходы по финансовой деятельности	130	-10 789	-7 342
в том числе: проценты к уплате	131	-7 862	-6 649
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	-2 668	-317
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-259	-376
Прибыль (убыток) от инвестиционной и финансовой деятельности (100-110+120-130)	140	-10 863	-6 486
Прибыль (убыток) до налогообложения (±090±140)	150	23 708	-1 217
Налог на прибыль	160		
Изменение отложенных налоговых активов	170	-15	1
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	215	54
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190		
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	-3	-2
Чистая прибыль (убыток) (±150-160±170±180-190-200)	210	23 905	-1 164
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220		
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230		
Совокупная прибыль (убыток) (±210±220±230)	240	23 905	-1 164

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ДАЙ ПЯТЬ»

1. Организатором Рекламной игры является Общество с ограниченной ответственностью «АМАЗОН-КОЛОРИТ», юридический адрес: Республика Беларусь, Минская область, город Молодечно, ул. Тамары Дудко, 2А, комната 8, УНП 690305906, тел. +375 176 58 12 58, электронный адрес: info@202.by.

2. Наименование Рекламной игры: «Дай пять».

3. Территория проведения Рекламной игры: все официальные торговые участки ООО «АМАЗОН КОЛОРИТ», находящиеся на территории Республики Беларусь, и интернет-магазин «202.by».

4. Срок начала и окончания Рекламной игры, включая срок выдачи выигрышей и публикации результатов проведения Рекламной игры: с 16 мая 2022 г. по 16 августа 2022 г.

5. Свидетельство о государственной регистрации Рекламной игры № 4185 выдано Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь 29.04.2022.

6. Количество участников, выполнивших условия Рекламной игры, – 754 человека.

7. Информация о призовом фонде:

Размер призового фонда Рекламной игры составляет 9237,00 (Девять тысяч двести тридцать семь) белорусских рублей. Призовой фонд Рекламной игры разыгран полностью.

8. Информация о победителях Рекламной игры:

№	Игровой код	Фамилия, имя, отчество	Город	Приз
1	**00460**	**Беляевская Н. В.**	**Минск**	Электросамокат Kugoo M4 PRO 18 mah
2	**00042**	**Вольнов А. А.**	**Минск**	Электросамокат Kugoo M4 PRO 18 mah
3	**01723**	**Романов Ю. С.**	**Минск**	Электросамокат Kugoo M4 PRO 18 mah
4	**00769**	**Лебедева Н. Е.**	**Могилев**	Велосипед двухколесный, шарикоподшипниковый, без двигателя, горный для взрослых, размер колеса 27,5 рама — алюм. сплав, Rebel 750, LTD
5	**01878**	**Торманов В. С.**	**Минск**	Велосипед двухколесный, шарикоподшипниковый, без двигателя, горный для взрослых, размер колеса 27,5 рама — алюм. сплав, Rebel 750, LTD
6	**00183**	**Ганжина Е. В.**	**Минск**	Велосипед двухколесный, шарикоподшипниковый, без двигателя, горный для взрослых, размер колеса 27,5 рама — алюм. сплав, Rebel 750, LTD

Поздравляем победителей и благодарим всех принявших участие в Рекламной игре!

Информация для победителей

- Для получения приза Победителю необходимо явиться в офис Организатора по адресу: Минский район, Сенницкий с/с, район д. Колядичи, ул. Лазурная, 9, 3-й этаж, кабинет № 4 с 4 августа по 16 августа 2022 г. включительно, с 9.00 до 16.30 в будние дни. При себе Победителю необходимо иметь документ, подтверждающий личность (паспорт гражданина Республики Беларусь или вид на жительство), копию документов для оформления акта выдачи Призов Организатор оставляет у себя. В случае если Победитель не выполнит действия в обозначенный срок, он утрачивает право на получение Приза. Приз остается в распоряжении Организатора.

- Выдача Приза представителю Победителя осуществляется по нотариально удостоверенной доверенности.

- Приз не подлежит замене. Выплата денежного эквивалента Приза не осуществляется. Ответственность организатора по выдаче Приза ограничена количеством и видом Приза, указанными в Правилах.

- Организатор не оплачивает участникам Рекламной игры расходы, связанные с проездом и получением Приза.

- Победитель при получении Приза письменно подтверждает факт его получения, заполняет все необходимые документы, представленные Организатором, связанные с получением Приза.

